незалежная газета

№ 48 (694) 22 снежня 2010

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыдня, у серады



**Усё пра падзеі 19 снежня ў Мінску. Механіка правакацыі.**

Старонкі 3—8

**Форс-мажор**

У сувязі з надзвычайнымі падзеямі 19 снежня традыцыйны кніжны рэйтынг «Найлепшыя кнігі-2010» і музычныя вынікі года будуць апублікаваны ў №1 за 2011 год.

**У НУМАРЫ**

**Чалавек года — 2010 Мікалай Казлоў**

Па традыцыі ў апошнім нумары «Наша Ніва» вызначае людзей года. Тых, чые ўчынкі запомніліся, паўплывалі на гісторыю. **Старонка 11.**

**Што будзе ў Новым годзе?**

Каляндар-2011. **Старонка 9.**

Бо зіркі ў каляндар —
У дарозе Спадар,
Што для ўсіх нас вязе
падарунак…
**Калядны верш Андрэя Хадановіча. Старонка 2.**

**2010: здымкі года**

**Старонкі 9—15.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

# Падпал рэйхстага замест падліку галасоў



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## АБСЕ, Еўрасаюз і ЗША не прызналі выбараў

Выбары ў Беларусі нельга прызнаць свабоднымі і дэмакратычнымі, заявіў на прэс-канферэнцыі ў панядзелак у Мінску кіраўнік місіі кароткатэрміновых назіральнікаў БДІПЧ АБСЕ Тоні Лойд.

Ён падкрэсліў, што «арышты кандыдатаў у прэзідэнты і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і грубы разгон дэманстрацыі будуць з'яўляцца тым бэкграўндам, на якім будуць ацэньвацца гэтыя выбары».

Прэс-служба прэзідэнта Абамы распаўсюдзіла заяву «Аб беларускіх выбарах і палітычным гвалце». У ёй гаворыцца, што ЗША не могуць прызнаць законнымі вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі 19 снежня і заклікаюць неадкладна вызваліць усіх затрыманых.

ЗША назвалі дзеянні ўлады падчас выбараў «адназначным крокам назад».

Затое выбары прызналі цалкам свабоднымі назіральнікі ад СНД. «Вядучы кандыдат валодаў значнай перавагай, астатняе не мае значэння», — адзначыў кіраўнік місіі СНД Сяргей Лебедзеў. Ён таксама сказаў, што не разумее, «як звязаная акцыя пратэсту 19 снежня ў Мінску і прэзідэнцкія выбары».

У той жа час прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў у панядзелак назваў падзеі ў Мінску ўнутранай справай самой Беларусі, але «для Расіі важна, каб яны адлюстроўвалі суверэнную волю народа», заявіў прэзідэнт Расіі.

Ні ў панядзелак, ні ў аўторак, да моманту здачы нумара, віншавання ад Мядзведзева Лукашэнку так і не прыйшло. Дый сам Лукашэнка на сваёй прэс-канферэнцыі не назваў перамогу «элегантнай».

**Сяргей Мікулевіч**

**Лукашэнка геройствуе, але ж выбары праваліліся**

Каментар Андрэя Дынько. **Старонка 5.**

## Плошча-2010: як гэта было

На Кастрычніцкую плошчу дэмакратычныя кандыдаты ў прэзідэнты збіраліся весці сваіх прыхільнікаў з розных кропак Мінска.

Група на чале з Някляевам планавала выйсці а 19-й з боку вуліцы Няміга, ад офіса кампаніі «Гавары праўду». Мікалай Статкевіч і Віталь Рымашэўскі збіраліся стартаваць ад Прывакзальнай плошчы ў той самы час.

У апошні момант стала вядома, што Статкевіч пойдзе разам з някляеўцамі: ён затрымаўся ў офісе Някляева, абмяркоўваючы сцэнар Плошчы.

Два кандыдаты ў прэзідэнты ўзначалілі калону актывістаў, у сярэдзіне якой ехаў мікрааўтобус з гукаўзмацняльнай апаратурай. На крутым спуску вуліцы Калектарнай шлях шэсцю перагарадзіла машына ДАІ. Някляеўцы, не дабіўшыся толку перамовамі, паспрабавалі адкаціць яе. Раптам калону заблакавалі мікрааўтобусы, з якіх пасыпаліся спецназаўцы ў чорным. Выбухнулі шумавыя гранаты. Ціхары з мацюкамі паклалі на зямлю актывістаў і журналістаў, білі нагамі і дручкамі. Галоўнай іх мэтай была апаратура. Яны хутка перагрузілі яе ў свой аўтобус і з'ехалі.

Уладзіміра Някляева збілі да непрытомнасці. Яго на руках занеслі назад у офіс. Выклікалі «хуткую», дактары дыягнаставалі чэрапна-мазгавую траўму. Ачуняўшы, Някляеў адмаўляўся ехаць у шпіталь, але ўрэшце яго адвезлі ў Бальніцу хуткай дапамогі.

**Працяг на старонцы 3.**

**ВЕРШ НА КАЛЯДЫ**



## Табурэтка

*Уладзіміру Някляеву*

У дзяцінстве, калі
По радзімай зямлі
Дзед–Марозы хадзілі нярэдка,
Сам Святы Мікалай
Загадаць мог: «Чытай,
Хлопча, вершыкі! Вось табурэтка!»

Хоць ахвоты няма,
Ды ўхіляцца дарма,
Бо жалезная ўмова — чытанне,
Дзед Мароз тут — уласць:
Падарунка не дасць,
А тады й Новы год не настане!

Дзед Мароз — цяжкі лёс,
Адмарожаны нос,
Плюс гарэліца з раніцы шкодзіць…
Дык ці скажа ён мне,
Што чытай або не,
А Каляды ўсё роўна прыходзяць?

Усё так, толькі ледзь
Ты паспеў пасталець —
І ў самога з'явіліся дзеткі.
Лай свой час ці не лай,
Прыйдзе ў дом Мікалай,
І камусьці чытаць з табурэткі!

Першы — вып'е, другі —
З тэлескрыні мазгі
Небараку, што піў, прапалошча.
А ты прагнеш прыгод:
Каб настаў Новы год,
Ты стары праважаеш на Плошчы.

Бо зірні ў каляндар —
У дарозе Спадар,
Што для ўсіх нас вязе падарунак…
Ні даішнік, ні мент,
Ані іх прэзідэнт
Не пасадзяць яго ў пастарунак!

*20 снежня 2010*

### Самае чытанае на nn.by за 15 — 21 снежня

• Дэманстранты запоўнілі праспект, дайшлі да ЦВК
• Спецназ рассек Плошчу, кандыдаты ў прэзідэнты збітыя і затрыманыя
• Раманчук асудзіў «радыкалаў», усклаў віну за «беспарадкі» на Статкевіча, Саннікава, Рымашэўскага
• Як збівалі Някляева: фота і відэа
• Штурмам узята кватэра міліцыянта, што стрымліваў спецназ (+ відэа)
• Начштаба Някляева прызнаўся, што міліцыя не вінаватая. На ім сляды збіцця
• Як правакатары б'юць шыбы ў Доме ўрада — відэа і фота
• АБСЕ: Выбары ў Беларусі не былі ні свабоднымі, ні дэмакратычнымі
• Спіс затрыманых (увесь час абнаўляецца)
• Бюлетэнь з надпісам «Саня паедзе ў Гаагу» паклалі ў стос за Лукашэнку — відэа



25 снежня Нараджэнне Хрыстова святкуюць каталікі і пратэстанты, 7 студзеня — праваслаўныя.

## «Я прыйшоў, каб паслужыць»

Калядны зварот духоўнага лідара беларусаў замежжа, апостальскага візітатара беларусаў замежжа айца **Аляксандра Надсана**.



«Нязменны вобраз Айца, водбліск Ягонай спрадвечнасці, прымае выгляд слугі. Прыйшоўшы ад Дзевы Маці і не зазнаўшы змены, Ён застаецца тым, кім быў — спрадвечным Богам, — і прымае тое, чым не быў, стаўшыся чалавекам дзеля любові да людзей». Гэты гімн, які Царква пяе ў Дзень Нараджэння Хрыстовага добра перадае сэнс гэтага свята, менавіта што спрадвечны Бог у сваёй любові да нас стаецца адным з нас. Ён прыходзіць да нас не ў сіле, але як маленькае дзіцятка, чакаючы ад нас дапамогі і спагады. Аднак гэта было не звычайнае дзіцятка. Прарок Ісая больш як 700 гадоў да ягонага прыйсця казаў: «Дзіця нарадзілася нам, сын быў дадзены нам, на ягоных плячах спачыла ўлада» (Іс 9:6).

Дык, можа, і не дзіва, што Ягонае прыйсце ўстрывожыла тых, хто меў уладу. Дзіўная рэч — улада. Як неад'емная частка кожнага грамадскага ладу, яна ёсць формаю служэння бліжняму. Сам Хрыстос сказаў, што Ён прыйшоў «не каб Яму служылі, але каб паслужыць і аддаць жыццё за адкупленне многіх»(Мц 20:28). Тым не менш, нярэдка тыя, хто мае ўладу, паддаюцца спакусе ператварыць яе ў самамэту, як сродак самаўзвелічэння коштам іншых. Яна дзейнічае як наркотык, без якога яны не могуць жыць, і яны гатовыя на ўсякае злачынства, каб толькі ўтрымаць яе ў сваіх руках. І тады ўлада ператвараецца ў дыктатуру. Прыкладаў гэтага маем шмат у гісторыі і аж да нашых дзён.

У сувязі з трагічнымі падзеямі апошніх дзён у Беларусі шмат хто з беларусаў сустракае свята Нараджэння Хрыстовага з трывогаю ў сэрцы. Што чакае нас у будучыні? Няхай жа нованароджаны Хрыстос дасць супакой усім нам. Хай дасць зразуменне кіраўнікам дзяржавы, што ўсякая ўлада ад Бога, і таму накладае на іх абавязак паступаць згодна з Божымі законамі, інакш яны трацяць права кіраваць іншымі. А для ўсіх нас хай будуць суцяшэннем словы Збаўцы: «Прыйдзеце да мяне ўсе спрацаваныя і абцяжараныя, і я супакою вас; вазьмеце ярмо Маё на сябе і навучыцеся ад мяне, бо Я лагодны і пакорны сэрцам — і знойдзеце супакой для душаў вашых» (Мц 11: 28—29).

**а. Аляксандр Надсан**
**Каляды 2010 г.**

## Кесару не аддаць тое, што належыць Богу

Ліст віншавання і салідарнасці са Святой зямлі, дзе Бог стаўся чалавекам.

Каляды гэтага года, Божае Нараджэнне, на жаль, будуць азмрочаныя ў шматлікіх беларускіх сем'ях. Гэтыя сем'і не здолеюць сабрацца разам за святочным сталом. Шмат хто з нашых будзе вымушаны спаткаць свята за кратамі. І віной таму 19 снежня, дзень выбараў прэзідэнта.

Хочацца звярнуцца да ўсіх тых, каго пазбавілі свабоды. Чалавека лёгка пасадзіць за краты — бо тое, што ён інакш галасуе, інакш думае, інакш размаўляе, інакш жыве, так часта выклікае гнеў і жаданне пазбавіцца яго.

У нашым грамадстве далёка не кожны можа знайсці месца для сябе. Асабліва калі не хочацца здраджваць свайму сумленню і заставацца чалавекам. Такім чалавекам, якім аднойчы, дзве тысячы гадоў таму, стаўся Бог.

Шмат хто з тых, хто 19 снежня апынуўся ў вязніцы, пачуваецца сёння пакінутым, здраджаным і самотным. І мала хто з моцных гэтага свету адважыцца і захоча ўзняць голас у іх абарону.

Але і сам Хрыстос, як сцвярджаюць Пісанні, быў здраджаны і асуджаны на смерць тагачаснымі элітамі, як палітычнымі так і духоўнымі. Чалавек, які жадае жыць у свабодзе і праўдзе, быць гаспадаром свайго лёсу, небяспечны для кожнай сістэмы і ва ўсе часы.

На шчасце, толькі Бог мае права і моц сказаць апошняе слова ў нашым жыцці, і мы яго абавязкова яшчэ пачуем. Важна толькі і праз слёзы, і боль не зламацца — кесару не аддаць тое, што належыць Богу.

25 снежня 2010 года, у дзень Божага Нараджэння, цэлебруючы Святую імшу ў Віфлііеме, буду маліцца за ўсіх, каго збілі, прынізілі і пасадзілі ў турму ў тую крывавую нядзелю ў Мінску. Каб здзейсніліся словы Евангелля ад Мацвея: «...быў у вязніцы і адведалі Мяне». Няхай свята Божага Нараджэння ўпэўнівае вас, што Бог не забыўся. Бог жыве ў сваіх сынах і дачках, што шукаюць свабоды. Бог жыве ў вас.

Хочацца таксама прасіць іерархаў Касцёла і Праваслаўнай царквы заступіцца за тых, хто пацярпеў ад гвалту 19 снежня. Хіба наша вера не вучыць быць міласэрнымі і станавіцца на бок слабейшых? Хіба мы не можам звярнуцца і папрасіць улады, якія павінны спрыяць згодзе і паразуменню ў грамадстве, учыніць акт добрай волі і на дзень Божага Нараджэння вызваліць тых, хто быў затрыманы? Моцна спадзяюся, што мы ўсё яшчэ верым у словы Госпада нашага: «...так як вы зрабілі аднаму з гэтых братоў маіх меншых, то Мне зрабілі». (Мц 25.40)

**Са Святой зямлі, з малітвамі,**
**кс. Юры Барок**


# Не забудзьцеся падпісацца!

### Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 4 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

**Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.**

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты:**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

### Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

**Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»:** для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

### Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Аляксандру П. з Жлобінскага раёна.
Г.К., Генадзю С. з Магілёва.
Л.Ш., Уладзіславу І. з Віцебска.
Юрыю Г. з Гродна.
Ірыне Ц. з Рэчыцкага раёна.
А.А., Аляксею Б., Л.Л., Анастасу С., З.Д. з Мінскага раёна.
Віктару Д. з Капыльскага раёна.
Аляксандру К. з Полацкага раёна.
Анатолю П., Раісе Д. з Салігорскага раёна.
Юрыю Р., В.Н. з Лідскага раёна.

# Плошча-2010: як гэта было

Працяг са старонкі 1.

Пацярпелі яшчэ некалькі актывістаў: Аляксандру Арцыбашаву моцна разбілі галаву, разбілі твар і Андрэю Дзмітрыеву, кіраўніку штаба Някляева. Дзмітрыеў і павёў калону някляеўцаў са сцягамі на Плошчу. Дайшлі яны спакойна.

Ля офіса застаўся бусік ад апаратуры з выбітым бакавым шклом.

Групе Рымашэўскага пашанцавала больш. Дзве-тры тысячы чалавек дабраліся да Кастрычніцкай без сутыкненняў з сілавымі структурамі — на праезную частку не выходзілі, пераходы міналі пад зямлёй.

## Адваяваная машына

90% Кастрычніцкай плошчы займала гіганцкая коўзанка. Палац прафсаюзаў, на прыступках якога пачыналася Плошча ў 2006-м, быў адгароджаны шэрагам вагончыкаў з хот-догамі. На ўсю моц раўла поп-музыка з дынамікаў над катком.

Уздоўж праспекта стаяў ланцуг даішнікаў. Многія кіроўцы аўто віталі дэманстрантаў сігналамі.

Да Белсаўпрафа праз кардон ДАІ пад'ехаў... другі джып з апаратурай. Лідары апазіцыі здолелі перахітрыць спецслужбы, мелі, аказваецца, запасны, патаемны варыянт. ДАІшнікі і ціхары ў штацкім спрабавалі перашкодзіць арганізатарам яе выгружаць, але дэманстрантаў было больш. Наступныя хвілін дзесяць намеснік старшыні мінскай міліцыі пагладжаў карцінку на відэакамеры аднаго з ціхароў, каб высвятліць, хто прапусціў джып. «Вінаватага» даішніка на ўсялякі выпадак замянілі на іншага.

## Клікаў на рэзідэнцыю — пайшлі да ЦВК

Тым часам на прыступках Палаца пачаўся мітынг. Мікола Статкевіч пад авацыі прысутных заявіў, што незалежныя экзіт-полы далі Лукашэнку толькі 37% галасоў. Было заяўлена аб стварэнні «ўрада народнага даверу», у які мусяць увайсці ўсе дэмакратычныя кандыдаты.

Чуць выступоўцаў можна было толькі ля самых прыступак. Далейшым перашкаджала невыносна гучная поп-музыка на коўзанцы. Можа быць, каб не музыка, мітынгоўцы затрымаліся б на Плошчы. Але лідары бачылі, што тут утрымаць увагу людзей было б немагчыма.

Статкевіч заклікаў ісці да лукашэнкаўскай рэзідэнцыі. Але найбольшая колькасць аўтазакаў са спецназам канцэнтравалася менавіта там. Таму шэсце разлілося морам па шырыні ўсяго праспекта і з воклічамі «Жыве Беларусь!» рушыла ў іншы бок — да плошчы Незалежнасці.

Некалькі дзясяткаў даішнікаў паспрабавалі стаць на шляху шматтысячнага шэсця на выхадзе з Кастрычніцкай плошчы. Хто не хацеў валтузні, проста абышоў іх рэдкі ланцуг, хто жадаў паштурхацца з даішнікамі, прарваў сімвалічную перашкоду.

У гэтай частцы акцыі ДАІ працавала бездакорна, вызваляючы ад аўтамабіляў праезную частку. Кіроўцаў накіроўвалі аб'языні вуліцамі — святу дэмакратыі не павінна было перашкодзіць нічога.

Тыя, хто ішоў наперадзе, азіраліся, каб пабачыць, ці багата людзей ззаду. Але натоўп распасціраўся на шмат далей за мяжу бачнасці. Маладзёны, якія не памятаюць шматтысячных акцый 1996-га, залазілі адзін аднаму на плечы і з вышыні з захапленнем верашчалі: «А-а-а! Ды тут за 100 тысяч чалавек!» Вядома ж, яны перабольшвалі, але ў тым, што колькасць маніфестантаў сапраўды перавысіла 30 тысяч чалавек, не сумняваўся, бадай, ніхто.



СЯРГЕЙ БАЛАЙ

## Бел-чырвона-белае КДБ

Асмялелыя дэманстранты спыніліся пад Камітэтам дзяржбяспекі. Хлопцы застылі з бел-чырвона-белым сцягам у руках ля калоны будынка, вагаючыся, ці варта пакінуць тут напамін пра сябе. Гуляць дык гуляць! Праз некалькі секунд яны, адкінуўшы сумневы, ужо мацавалі сцяг побач з камерай відэаназірання пад авацыі дэманстрантаў.

Кандыдаты ў прэзідэнты ішлі па праспекце ў коле дружыннікаў.

Спыніўшыся на праезнай частцы ля плошчы Незалежнасці, кандыдаты сталі думаць, куды ісці далей. «Да касцёла!» — разнеслася па натоўпе. Да Чырвонага касцёла прадстаўнікі штабоў падцягнулі гукаўзмацняльную тэхніку, палітыкі пачалі выступаць. Нехта ўдарыў у Звон, умацаваны каля будынка. Але натоўп пачаў ліцца далей, да Дома ўрада. Кандыдатам з апаратурай давялося перамясціцца на ўзвышэнне ля помніка Леніну.

## Ленін — рухавік дэмакратыі

Сімвалічна, што першым выступоўцам пад плячом Леніна стаў Сяргей Калякін. Раскацістым голасам камуністычны палітык абвясціў пра фальсіфікацыі.

Віталь Рымашэўскі запатрабаваў вызвалення палітзняволеных.

Саннікаў заклікаў не разыходзіцца, тэлефанаваць знаёмым, каб ехалі на плошчу. Але галоўным пасылам, які яднаў кандыдатаў, было патрабаванне перамоваў з кіраўніцтвам сілавых структураў і ўрадам. «Урад народнага даверу» збіраўся прайсці ў будынак Дома ўрада і там чакаць прадстаўнікоў улады.

Было заўважна, што на Плошчы многа людзей, у звычайныя дні далёкіх ад палітыкі. Пра час і месца яны дазналіся, відавочна, з тэлевыступаў кандыдатаў на дзяржаўных каналах. «Што далей? Пагаворым і разыдземся?» — пыталіся гэтыя людзі ў журналістаў.

Нават аперэтачная лібералізацыя дала магчымасць тым, хто прагне пераменаў, пабачыць, наколькі іх шмат.

## Па кім звінела шкло?

У гэты час дэманстранты, што знаходзіліся бліжэй да ўваходу ў Дом урада, пачулі звон разбітага шкла. Невядомыя нагамі выбівалі шкло ў дзвярах. Да іх падбеглі дружыннікі і з крыкамі «Правакатары!» сталі адцягваць «выбівальшчыкаў». Трое разбітых дзвярэй — такім стаў вынік першага налёту невядомых.

Мітынг працягваўся. Кандыдаты нагадвалі, што акцыя носіць выключна мірны характар і заклікалі не паддавацца на правакацыі. Але асноўнае дзеянне цяпер адбывалася ля ўваходу ва ўрадавы будынак. Дэманстранты заўважылі, што ў вокнах нацыянальнага схода, які размяшчаецца ў правым крыле будынка, з'явіліся спецназаўцы са шчытамі. Яны стаялі для застрашвання — не выходзілі з будынка, але і не хаваліся.

Калі ўвага дружыннікаў ля пабітых дзвярэй аслабла, пачаўся другі акт біцця шкла. Той самы, які пасля паказвала дзяржаўнае тэлебачанне.

У ход пайшлі рыдлёўкі і кавалкі лёду. Вось ужо дзверы адчыненыя — ці хутчэй адарваныя. І тут высвятляецца, што за імі стаяць загадзя падрыхтаваныя барыкады. Спецназаўцы трымалі шчыты і сталы, якія спрабавала расхістаць моладзь.

Кандыдаты ў прэзідэнты пусцілі працэс на самацёк. Адзін Рымашэўскі апантана спрабаваў правакатараў спыніць.

## Вусаты з агнягаснікам

У гэты час з розных бакоў да Дома ўрада пачыналі падганяць спецтэхніку са спецназаўцамі. Першы набег людзей са шчытамі прымусіў натоўп адступіць на некалькі метраў ад дзвярэй. У мітусні раздаўся нягучны выбух, і дэманстрантаў завалакло дымам. «Газ!» — крыкнуў нехта, але яго адразу ж супакоілі: «Парашковы агнягаснік нехта распыліў».

І пасля гэтага эпізоду па Плошчы хадзіў невядомы вусаты мужчына з агнягаснікам напагатове. Неўзабаве спецназ адшоў у чаканні падтрымкі, а моладзь вярнулася да ранейшага занятку. На наступны дзень АНТ расказала пра знішчаны першы паверх будынка, але насамрэч ніхто так і не прайшоў далей за дзверы.

## Цемра

Чарговы налёт спецназаўцаў быў больш сур'ёзным. Яны адсеклі групу ў паўтысячы чалавек, якая стаяла бліжэй да дзвярэй у будынак, ад астатняга натоўпу і пачалі звужаць кола з трох бакоў. Крыкаў: «Дапамажыце! Б'юць!» — ніхто з выступоўцаў так і не пачуў. Той шчасліўчык, хто ўбачыў выхад з чацвёртага боку, уратаваўся і здолеў уцячы, каб далучыцца да грамады. Вось толькі ненадоўга. З аўтазакаў выбягалі новыя і новыя спецназаўцы. «Пад раздачу» трапіў і лейтэнант міліцыі ў форме. З акрываўленай галавой, ён абурана звяртаўся да бязлікіх спецназаўцаў у шлемах: «Вы што — дэбілы?! Я шэсць гадоў у міліцыі, я войска прайшоў, ну — удар мяне! Я цябе біць не буду — удар!» (Больш пра гэты эпізод на старонцы 6.)

«Просім кіраўніцтва спецназа падысці да нас для перамоваў», — прасіў Рымашэўскі. Праз хвіліну ён заявіў, што дасягнута дамоўленасць — апазіцыя здымае гукаўзмацняльную апаратуру, а дэманстрантаў ніхто не збіве. Аднак збіццё працягвалася.

Лідараў апазіцыі імгненна адрэзалі ад натоўпу і пачалі збіваць. Асабліва стараліся ціхары ў штацкім, якія дабівалі ляжачых. «Наступная акцыя заўтра, а 18-й на Кастрычніцкай плошчы!» — паспеў пракрычаць Рымашэўскі. Яму разбілі галаву. На плошчы пагасла асвятленне.

## Блакаваць і рассякаць

Спецназаўцы наступалі шэрагамі, грукаючы ў шчыты. Часта, замест застрашэння, гэта выклікала смех: людзі пачыналі пляскаць у такт, кідацца снежкамі.

Большая частка людзей пабегла да праспекта Незалежнасці. Аднак уздоўж яго стаялі ланцугом салдаты ўнутраных войскаў і вайсковыя машыны. Дэманстранты апынуліся ў пастцы — ззаду падціскаў спецназ. Свабодным заставаўся бок каля Чырвонага касцёла і гатэля «Мінск». Раптам Унутраныя войскі разышліся, даўшы магчымасць частцы людзей перабегчы на іншы бок праспекта, да галоўнага корпуса БДУ і Мінгарвыканкама. Частка з іх ускочыла ў метро ці аўтобусы і з'ехала дамоў. Іншыя былі збітыя ціхарамі ў двары БДУ.

Найбольш брутальна спецназ дзейнічаў з тымі, хто яшчэ заставаўся на плошчы. Яе разбілі на сектары і жорстка зачысцілі. Людзей збівалі дубінкамі і нагамі. Тое самае ажыццявілі на праспекце Незалежнасці, вуліцы Валадарскага, дзе маніфестантаў рассеклі на групы. Сотні людзей, у тым ліку паслы шэрагу краін Еўрасаюза і кіраўнік прадстаўніцтва Еўракамісіі, ратуючыся ад спецназа, аказаліся блакаванымі ў гатэлі «Мінск».

Яшчэ доўга Унутраныя войскі трымалі ачапленне Плошчы Незалежнасці, а спецназаўцы адлоўлівалі па двары купкі дэманстрантаў. Апазіцыянерам не давалі вярнуцца на Кастрычніцкую. Да поўначы пратэст скончыўся.

Некалькі збітых трапіла ў мінскія бальніцы.

Назаўтра афіцыйная прапаганда шалела, паказваючы пустую плошчу, усыпаную арматурай. Паказалі і муляж «кактэйля Молатава» — у пластыкавай (!) бутэльцы. Нічога такога ў часе мітынгу журналісты не бачылі.

Падчас прэс-канферэнцыі 20 снежня Аляксандр Лукашэнка назваў лічбу затрыманых на Плошчы: 639 чалавек. Суды канвеерам давалі ім суткі за парушэнне парадку правядзення масавых акцый і за хуліганства. Такіх масавых затрыманняў Мінск не ведаў ад 2006 года. Такіх маштабных пратэстаў — ад 1996-га.

**Віталь Несцераў, Сяргей Мікулевіч, Зміцер Панкавец, Алесь Пілецкі**

# Як правакатары білі шыбы ў Доме ўрада

У сеціве працягваюць з'яўляцца шматлікія фотаздымкі і відэа, якія сведчаць пра тое, што правакацыі каля сценаў Дома ўрада загадзя планаваліся. З'явілася відэа і фота маладога чалавека, які перад біццём вокнаў гаворыць у мікрафон, схаваны ў рукаве. А ў пэўны момант ён падыходзіць да дзвярэй і ціхенька стукае ў шкло.

Блогер Дзяніс Карпенка паспеў сфатаграфаваць чалавека, які падносіць да ганку Дома ўрада рыдлёўкі. Да штурму заставаліся лічаныя хвіліны. Да Дзяніса падышоў чалавек ў цывільным, які настойліва параіў яму паказаць зробленыя кадры, але той адмовіўся.

Пасля разгону дэманстрантаў на апусцелай плошчы Незалежнасці незалежныя журналісты сталі сведкамі таго, як спецназаўцы пад аб'ектывамі камер дзяржаўных тэлеканалаў раскідвалі каля помніка Леніну кавалкі арматуры. На наступны дзень у сюжэтах на БТ гэта падавалася, як быццам арматуру на плошчу з сабой прынесла апазіцыя.

Усе гэтыя здымкі і відэа можна пабачыць на сайце «Нашай Нівы» NN.BY.



**Мужчына б'е вокны збоку ад галоўнага ўваходу. Апаратары (?) спецслужбаў здымаюць яго са спіны.**



АЛЯКСЕЙ ГРОМАЎ

**...Вось ён ужо з іншай «зброяй» — пакункам ксеракснай паперы.**




АНДРЭЙ СМІРНОЎ

**...А тут ён тузаецца са спецназаўцам, але той яму не адказвае.**



**Гэты чалавек каля ўвахода ў Дом урада, паводле назіранняў журналістаў, «па-бацькоўску» падбухторваў моладзь.**



AK-BARA.LIVEJOURNAL.COM

**Гэты чалавек перамаўляўся праз схаваны мікрафон. Менавіта ён разаб'е дзверы. За ім кандыдат Рымашэўскі спрабуе спыніць правакатараў. Перад ім (у кажушку) яшчэ адзін правакатар, якога адцягнулі ад уваходу дэманстранты.**



KARPENKOD.BLOGSPOT.COM

**Гэты чалавек прынёс рыдлёўкі да ганку Дома ўраду за лічаныя хвіліны да штурму.**

# Лукашэнка сачыў за Плошчай у жывым эфіры

«Доступ да цела» Аляксандра Лукашэнкі прадстаўнікі незалежнай прэсы маюць рэдка. Напрыклад, падчас паслявыбарчых прэс-канферэнцый.



## Неэлегантна

Да будынка Палаца Рэспублікі я падышоў за паўгадзіны да пачатку мерапрыемства. Ахоўнік паведаміў, што мяне ў спісах акрэдытаваных няма. Паклікалі супрацоўніка прэс-службы.

«Ну, вы ж ведаеце, што на мерапрыемствы з удзелам прэзідэнта трэба акрэдытоўвацца за тры дні», — кажа ён.

«Дык выбары ж толькі ўчора былі, а раптам бы не перамог», — пасмяяўшыся, вырашылі прапусціць усярэдзіну. Месцы ў зале, дзе за два тыдні да гэтага праходзіў усебеларускі хурал, паціху пачалі займаць старшыні райвыканкамаў, іншыя чыноўнікі, хлопцы і дзяўчаты з БРСМ, рэдактары дзяржаўных газет. У шэраг сядзелі міністры і старшыні камітэтаў.

На сцэне ўбаку ад Лукашэнкі сядзеў яшчэ яго прэс-сакратар Павел Лёгкі. Кіраўнік дзяржавы раз-пораз звяртаўся да яго з пытаннямі: «А ты нямецкую ведаеш?», «У зале гукаапаратар ёсць?»

Сам жа Лукашэнка быў разнерваваны. Відаць, падзеі папярэдняй ночы глыбока ў ім заселі. Назваць перамогу элегантнай ці лёгкай ён так і не адважыўся.

## Сам аддаваў загады

Спачатку ён павіншаваў сваіх прыхільнікаў з перамогай, а потым паспачуваў працаўнікам, што наступную пяцігодку ім давядзецца жыць з Лукашэнкам.

Лідар адразу абрынуўся з папрокамі на Еўрасаюз: па іх патрабаваннях ну ўсё было зроблена, але іх не задаволіла, што бюлетэні моўчкі лічаць. «Былі ці то выбары, ці то ток-шоу «За шклом», — сказаў ён.

Потым патлумачыў, чаму апазіцыю не ўключалі ў выбарчыя камісіі, бо яны спрэс судзімыя. Пра тое, як і хто іх на тыя суткі і гады асуджваў — прамаўчаў. Затое казаў, што апазіцыя рыхтавала правакацыі і фальсіфікацыі. Толькі дзякуючы сумленнасці работнікаў камісій фальшавання ўдалося пазбегнуць.

«Някепскі вынік, — сказаў Лукашэнка пра працэнт, напісаны Ярмошынай. — Але ёсць над чым падумаць».

А потым яго панесла, бо ўспомніў падзеі на плошчы Незалежнасці і Кастрычніцкай. Ён прызнаўся, што сачыў за імі на экране ў рэзідэнцыі ў жывым эфіры. І асабіста аддаваў загад на зачыстку. Ледзь тэатральна не пусціў слязу, калі гаварыў пра салдацікаў, якіх быў вымушаны кінуць у бой.

«Я ім казаў: «Калі ласка, не правакуйце людзей, але калі вам у твар пляваць будуць, то адкажыце. Яны гэтага хацелі — яны гэта атрымалі».

## «Пішуць бесталкова»

Журналісты дзяржаўных СМІ віншавалі Лукашэнку з перамогай і засыпалі яго кампліментамі. Яму гэта, безумоўна, падабалася.

А потым пытанне ад «Інтэрфакса»: ці пасадзяць Някляева? І ўсмешка зноў знікае з яго твару. Лукашэнка ледзь не пераходзіць на крык. «Усе будуць сядзець па законе. Я ў турму нікога не саджаю».

«Я чалавек ранімы», — неяк вырвалася з ягоных вуснаў.

Лукашэнка адзначыў, што ніякай змены курса пакуль не будзе. Папракнуў тых самых дзяржжурналістаў, якія пішуць «бесталкова пра змену курса». Аспрэчваў Вікілікс — казаў, што ўкінутая за пару дзён да выбараў інфармацыя пра тое, што Лукашэнка — найбагацейшы чалавек Беларусі з 9 мільярдамі даляраў і што на сустрэчы з міністрам замежных спраў Эстоніі ён крытыкаваў Расію за вайну на Каўказе — суцэльнае трызненне.

Калі да мікрафона падышоў журналіст «Народнай волі», Лукашэнка найперш пацікавіўся, ці «жывы-здаровы мой даўні сябра Іосіф Паўлавіч Сярэдзіч». Калі пачуў станоўчы адказ, пачаў перадаваць вітанні.

Журналіст запытаўся, ці меў Лукашэнка права балатавацца на гэтыя выбары і ці зменіцца пасля іх стаўленне да апанентаў. Лукашэнка ад адказаў сышоў: засяродзіўся на змесце «Народнай Волі». Паведаміў, што Макей правярае публікацыі, «але 90% выяўляецца хлусні». Але ўрэшце папрасіў выпісаць яму газету.

Павесяліў Лукашэнку дзівак — граф Аляксандр Прушынскі. «Граф, колькі ж мы не бачыліся!» — сустрэліся два ўдзельнікі прэзідэнцкай кампаніі-1994. Ён не прадстаўляе ні СМІ, ні якую арганізацыю, аднак на прэс-канферэнцыю яго акрэдытавалі. Каб злегкаважыць БХД? На дзівоснай беларуска-польска-рускай трасянцы «граф» прасіў вярнуць вернікам касцёл святога Язэпа. «У мяне не проста ўзяць», — адказаў Лукашэнка.

## Адказаў на пытанне «Нашай Нівы»

Ну, калі выпала такая магчымасць, чаму б не задаць пытанне, падумаў я і пацягнуўся да мікрафона. Запытаўся, ці справядліва падзеі ля Дома ўрада параўноўваюць з падпалам рэйхстага. Здаецца, Лукашэнку зачапіла, бо адказваў хвілін пятнаццаць.

«На шчасце, нічога не загарэлася. У падвалах НКВД нікога не каталі. Самі робяць заявы. Кажуць: «Нам сорамна», — як сказаў апошні з іх. Некаторай праўды нават я не ведаў, але начальнік штаба Някляева прызнаўся.

Ад маці паступіў званок: ратуйце дзіця, пайшоў з дому, узяў тэрмас, у тэрмасе выбухоўка. Праз нейкі час мы знайшлі гэтага хлопца. Ніякай выбухоўкі там не было. Проста ад іх пайшла маса правакацыйных выкідаў пра нажы, выбухоўку і гэтак далей. Але хто мог адрозніць, дзе правакацыя, дзе не правакацыя. У сем паступіла інфармацыя, што на Нямізе ў аўтамабілях ёсць тое, чаго не павінна быць. Пад'ехалі — прад'явіце аўтамабілі для нагляду. Нарад міліцыі быў змяты, іх было 64 чалавекі, прыйшло падмацаванне. І што там было ў аўтамабілях? Мы гэта пакажам усім.

Дзякуй гэтаму хлопцу, начальніку штаба, які сказаў усю праўду. Далей мне проста сорамна расказваць. Някляеў паехаў у бальніцу. Я званю міністру аховы здароўя Жарко, ён кажа: нічога страшнага, драпіна. Някляеў рвецца на плошчу, бо там без яго падзялілі ўладу. Падзеі на плошчы скончыліся, і міністр кажа, што Някляеў ужо не хоча з бальніцы сыходзіць. А ён там адляжацца хоча. А тут і Рымашэўскі, крычыць «далі па галаве». Дык ты ж мужык, ну далі, ну і што? Я глядзеў расійскія СМІ, думаў, што ён там памёр, але гляджу — жывы. Які ж ты прэзідэнт, калі табе па мордзе далі, а ты лямантуеш на ўвесь свет?»

Пасля гэтага ён паспрабаваў саштурхнуць ілбамі сваіх канкурэнтаў. «На Плошчы яны павінны былі прыняць рашэнне па лідару: хто будзе замест Мілінкевіча», — сказаў Лукашэнка.

«Ён [Някляеў] адкрыта сказаў: мэта яго — раскруціцца ў прэзідэнцкай кампаніі як кандыдату і з гэтага трампліна выйсці на парламенцкія выбары. Ну, трэба ж старасць забяспечыць», — дасціпнічаў Лукашэнка.

Аднак, заявіў ён, у гэтай жа ролі бачыла Андрэя Саннікава яго жонка. «Але аб гэтым даведаўся Саннікаў. Калі яшчэ Саннікаў даведаўся — гэта паўбяды. Але даведалася «мамка» [жонка Саннікава Ірына Халіп] і кажа: «Ты будзеш лідарам!» Ёй, бач, першай лэдзі захацелася быць, таму яна стала штурхаць Саннікава да таго, каб ён на Плошчы заявіў», — заявіў Лукашэнка так, нібы ён асабіста праслухоўваў прыватныя размовы Саннікава і Халіп.

Лукашэнка спрабаваў ізноў сутыкнуць і розныя крылы апазіцыі: «Рымашэўскі прыйшоў у шал, — працягваў ён. — «Я гэтым казлам прарасейскім не дам захапіць уладу», і пачаў каля вакзала збіраць сваіх людзей. Ён там сабраў тры калоны [напраўдзе — адна], і яны пайшлі сюды. І ў іх ужо намеціўся раздрай... пачалая бойка каля Палаца прафсаюзаў [журналістам нічога такога невядома]», — расказваў Лукашэнка.

«Таму давайце на гэтым скончым, больш бязглуздай дэмакратыі, бесталковай дэмакратыі у нас у краіне не будзе», — так закончыў Лукашэнка адказ на пытанне «НН».

Яшчэ Лукашэнка паспеў паведаміць, што на выбарах упершыню галасаваў за сябе. А адносіны з Расіяй будуць паляпшацца. Асаблівага энтузіязму ён не выпраменьваў.

**Зміцер Панкавец**

# Лукашэнка геройствуе, але ж выбары праваліліся

Каментар **Андрэя Дынько**.

Яшчэ гадзіна-другая — і большасць людзей з Плошчы разышлася б сама сабой. Было каля 23.30. Мароз мацнеў. Але іх разагналі паказальна. Засадзілі ўсіх кандыдатаў. Ці гэта была загадзя спланаваная акцыя — каб памяталі: літасці не будзе нікому? Ці так раз'юшыла дзёрзкасць дэманстрантаў, і гэта быў нервовы зрыў, праява паталагічнай жорсткасці?

Выбары пачыналіся як фарс, а скончыліся фантасмагорыяй: сем кандыдатаў у турме, адзін збіты да паўсмерці. Сістэма не вытрымала ўласнай лібералізацыі.

Тры абяцаныя мільярды еўра ад Сікорскага пабітыя чатырма рэальнымі мільярдамі даляраў ад Мядзведзева. Многія чакалі трыумфу кіраванай дэмакратыі, а замест яе вярнулася дыктатура, абапертая на амонаўскія шчыты.

Удалося пасеяць страх. Але што далей? Лукашэнка, мякка кажучы, не ззяў на троннай прэс-канферэнцыі. Гэтую перамогу элегантнай не назавуць.

Апазіцыя была разрозненая, Захад гатовы заплюшчваць вочы, а Расія вярнулася ў ролю спонсара. Перамога здавалася гарантаванай, а аказалася самай тапорнай.

Аплявухай стала зацяжное маўчанне Мядзведзева, які на момант здачы нумару так і не даслаў Лукашэнку віншавання.

Праціўнікі Лукашэнкі дабіліся свайго: даказалі, што выбары не былі свабоднымі. Дарагім коштам уласнай свабоды.

Захад адкажа на крывавы разгон санкцыямі. На санкцыі можна будзе спісаць эканамічныя цяжкасці. Толькі грошай ад таго не дадасца. Лукашэнка пачынае чацверты тэрмін з правалу.

# Раманчук асудзіў Плошчу, сустрэўся з Лукашэнкам

У ранішнім выпуску навінаў БТ 20 снежня кандыдат у прэзідэнты ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі Яраслаў Раманчук асудзіў дзеянні «радыкалаў» на плошчы і ўсклаў віну за «беспарадкі» на Статкевіча, Саннікава і Рымашэўскага.

Сваю заяву ён зачытваў, не падымаючы вачэй ад паперкі, — хоць ніколі па паперцы не выступае, нават свае тэлезвароты рабіў без шпаргалкі.

«Падзеі ночы 19 снежня паставілі пад пагрозу жыццё людзей», — чытаў ён. «А.Саннікаву, падаграванаму ягонай жонкай І.Халіп, вельмі хацелася сарваць далікатны дыялог, які зараджаўся паміж Беларуссю і міжнароднай супольнасцю», — працягваў. — Масавыя акцыі з ужываннем сілы не здольныя стварыць атмасферы для паўнавартага грамадскага дыялогу».

«Акцыя павінна была быць праведзена згодна з ранейшымі дамоўленасцямі. Мы павінны былі сабрацца на Кастрычніцкай плошчы і там мірна чакаць вынікаў выбараў. Аднак без кансультацый з маім штабам, са мной, было вырашана ісці да Дома ўрада», — распавёў карэспандэнту «НН» Яраслаў Раманчук.



Палітык дадаў, што лічыць дзеянні апазіцыі на плошчы Незалежнасці правакацыйнымі: «Ну, пайшлі па праспекце. Ну, залезлі на Леніна... І што далей? Я таксама быў там. Бачыў, што плана дзеянняў не было. Гэтыя эмацыйныя рэчы і склалі падмурак для беспарадкаў».

У той жа час Раманчук кажа, што зрабіў заяву, каб выратаваць АГП: яму паведамілі аб планах уладаў «разабрацца з палітычнымі партыямі», прадстаўнікі якіх вечарам 19 снежня ўдзельнічалі ў арганізацыі акцыі пратэсту.

Падвечар 20 снежня Раманчуку патэлефанавалі з Адміністрацыі прэзідэнта і прапанавалі сустрэцца з Лукашэнкам. Кароткая размова мела месца пасля прэс-канферэнцыі Лукашэнкі ў Палацы Рэспублікі. Са словаў Раманчука, яна датычыла пераважна лёсу арыштаванага Анатоля Лябедзькі: «Я запытаўся, ці можна разлічваць на яго вызваленне ў бліжэйшы час. Лукашэнка адказаў: «Пабачым».

Лукашэнка пацікавіўся ў Раманчука наяўнасцю прапановаў для супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы. У часе выбарчай кампаніі Лукашэнка назваў прапановы Раманчука «смешнымі». Размова мела сімвалічны сэнс: улада паказвае, што гатовая супрацоўнічаць з сіламі, якія згаджаюцца на прапанаваныя «правілы гульні».

На наступны дзень, 21 снежня, стала вядома, што Лябедзька ўтрымліваецца ў ізалятары.

**Алесь Пілецкі**

**Дзмітрыеў прызнаўся, што міліцыя не вінаватая. У яго сляды пабояў на твары**

Першы канал паказаў невялікае інтэрв'ю начштаба Някляева Андрэя Дзмітрыева. Той падзякаваў міліцыянтам і прызнаў, што гэта яны з Някляевым вінаватыя ў тым, што не прад'яўлялі дакументаў супрацоўнікам ДАІ і не давалі агледзець аўтамабіль. Няясна, ці была то рэальная заява, ці яна атрыманая ў выніку нарэзкі фрагментаў. Дзмітрыеў выглядаў стомленым і прыгнечаным. Бачныя сляды пабояў.

**Кастусёў: «Маё інтэрв'ю БТ — нарэзка»**

Услед за заявай бледнага Яраслава Раманчука і кваецістай лірыкай Віктара Цярэшчанкі ў эфіры БТ быў паказаны выступ Рыгора Кастусёва. Прамова кандыдата ад БНФ давалася кавалкамі. З іх вынікала, што Кастусёў таксама асудзіў беспарадкі 19 снежня, але наўпрост не звінаваціў арганізатараў акцыі. Сказаў толькі пра «шэраг людзей, якім захацелася зрабіць правакацыю». І адзначыў, што «расійскі бок зацікаўлены ў такім развіцці падзей у Беларусі». Пазней Кастусёў абверг свой выступ па БТ, назваўшы яго нарэзкай цытатаў.

# Лейтэнант Класкоўскі супраць спецназа

Затрыманы былы афіцэр міліцыі, які вечарам 19 снежня ў час акцыі пратэсту апазіцыі ўгаворваў спецназаўцаў не ўжываць сілу супраць дэманстрантаў.

Позна ўвечары 20 снежня ў кватэру Аляксандра Класкоўскага на праспекце Ракасоўскага ў Мінску ўламаліся гэбісты. Яны арыштавалі гаспадара, былога афіцэра міліцыі. Відэакадры, на якіх ён у кіцелі і са скрываўленай галавой угаворвае супрацоўнікаў міліцэйскага спецназа не ўжываць сілу супраць дэманстрантаў, абляцелі інтэрнэт.

Аляксандр кажа, звяртаючыся да міліцыянтаў: «Вы што, ідыёты?.. Бі лейтэнанта! Я шэсць гадоў да яго ішоў, я войска прайшоў. Бі! Ну, сур'ёзна — я цябе біць не буду, бі мяне!»





ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Чалавек ганіць спецназаўцаў. 19 снежня, плошча Незалежнасці.**

Кватэру А. Класкоўскага ўзялі штурмам трое супрацоўнікаў КДБ у цывільным. Яны канфіскавалі камп'ютар, фотаапараты, флэш-карты, а самога Класкоўскага павезлі ў невядомым кірунку ў кайданках.

На наступны дзень на сайце ГУУС з'явіліся пакаянныя паказанні Класкоўскага. Ён казаў, што быў выпіўшы і папрасіў прабачэння ў спецназаўцаў. «Паддаўшыся заклікам апазіцыі, я прыйшоў на Плошчу. Улічваючы, што я быў пад уздзеяннем алкаголю, паддаўся эйфарыі натоўпу...», — казаў А.Класкоўскі.

Паводле яго словаў, людзі пабачылі на ім міліцэйскую форму і спрабавалі збіваць: «Я пайшоў да ланцуга спецназу, каб выратавацца. Паказаць, што я на іх баку».

Відэа аспрэчвае яго словы. Бо размаўляе з спецназаўцамі яшчэ ў куртцы. І ніхто яго да іх не штурхае.

Як расказала сястра затрыманага Вольга Класкоўская, яе брата моцна збілі падчас затрымання: «Білі па твары і нырках, лаяліся, казалі, што пакажуць яму ў «амерыканцы» такое жыццё, што мала не будзе. Абвінавацілі ў тым, што ён плюнуў у твар спецназаўцу».

Аляксандр Класкоўскі праходзіў службу ў органах унутраных справаў з сакавіка 1999 года па сакавік 2005 года.

У аўторак МУС распаўсюдзіў заяву, што ў часе службы Класкоўскі «зарэкамендаваў сябе з адмоўнага боку як недысцыплінаваны супрацоўнік». Звольнены з МУС за кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане.

«Мой сын наіўна хацеў ачалавечыць спецназаўцаў», — так пракаментаваў усе гэтыя падзеі бацька лейтэнанта Класкоўскі, вядомы журналіст Аляксандр Класкоўскі.

**ЗП; naviny.by**



# Пасол Літвы абараняў дзяўчат на Плошчы ад збіцця

Старшыня Камітэта па міжнародных адносінах Сойма Літвы Эмануэліс Зінгерыс выказаў «глыбокае шкадаванне» ў сувязі з разгонам дэманстрантаў у Мінску 19 снежня, а таксама з затрыманнем і збіваннем апазіцыйных кандыдатаў у прэзідэнты. На яго думку, разгон і збіццё дэманстрантаў «у прынцыпе перакрэслівае заявы ўладаў Беларусі аб збліжэнні з Еўрасаюзам».

Зінгерыс заклікаў афіцыйны Мінск неадкладна адпусціць затрыманых і звярнуўся ў Камітэт па міжнародных адносінах Еўрапарламента правесці расследаванне.

Як паведамляе літоўскае агенцтва BNS, літоўскім дэпутатам, якія назіралі за ходам прэзідэнцкіх выбараў, не ўдалося пазбегнуць міліцэйскіх дубінак. «Не паспелі мы выйсці з гасцініцы, адразу трапілі ў атачэнне сіл АМАПа. Яны не лічыліся ні з кім», — заявіў на прэс-канферэнцыі адзін з назіральнікаў, дэпутат Андрус Шаджус.

«Я ўбачыў нашага пасла Эдмінаса Багдонаса, які кінуўся на абарону трох дзяўчат. Іх білі гумовымі дубінкамі, аднак пасла адціснулі спецсілы».

У гэтай жа гасцініцы знаходзілася і экс-прэм'ерка Літвы Казіміра Прунскене, якая ў эфіры Беларускага тэлебачання заявіла, што выбары былі добра арганізаваны», — піша BNS.

«Калі нас білі, да гасцініцы пад'ехаў «Мерсэдэс», з яго выйшла экс-прэм'ер Казіміра Прунскене. Багдонас стаў крычаць: «Прэм'ер, глядзіце, ваша дэмакратыя!» — а яна, нават не паварочваючыся, пабегла ў гасцініцу», — сказаў на заканчэнне Шаджус.

**Мікола Бугай**



# Звольнены Дарафееў?

## «Не валодаю ніякай інфармацыяй», кажа ён.

У хісткім становішчы аказаўся папулярны вядоўца АНТ Сяргей Дарафееў. Яму не даруюць шэрагу пытанняў да Лідзіі Ярмошынай у часе ток-шоу «Выбар», прысвечанага вынікам прэзідэнцкіх выбараў.

Дарафееў паводзіў сябе смела і задаваў Ярмошынай непрыемныя пытанні. Падчас перадачы ён атрымаў нейкую каманду ад рэжысёра ў навушнік, пачырванеў, але не спыніўся і працягнуў свае пытанні.

Ён спытаў у Ярмошынай, ці бачыла яна ролік, у якім у тэхнікуме куратарка адной з груп патрабуе ад навучэнцаў з'явіцца на датэрміновае галасаванне і ці з'яўляецца такая сітуацыя парушэннем заканадаўства. «Так, гэта парушэнне», — адказала Ярмошына. «Дык значыцца, выбары прайшлі з парушэннямі?» — падлавіў яе Дарафееў. У выніку Ярмошына пакінула студыю, заявіўшы, што ёй няма часу з ім лібералынічаць, пакуль у ЦВК заблакаваныя жанчыны.

Апроч таго, вядучы абараняў журналістку Святлану Калінкіну ад нападак з боку палітыка Сяргея Гайдукевіча.

Перадача выклікала асабістае незадавальненне Аляксандра Лукашэнкі, які падчас прэс-канферэнцыі назваў Дарафеева «хлопчыкам-журналістам, якога трэба паставіць на месца».

Сам Сяргей кажа, што ён застаецца ў невядомасці і пакуль яму ніхто пра звальненне не паведамляў.

Сяргей Дарафееў — адзін з самых яркіх прадстаўнікоў новага пакалення беларускіх тэлевядучых. Ён нарадзіўся ў 1980 годзе ў Мінску, закончыў БНТУ, а журналісцкую адукацыю атрымліваў за мяжой, выйграўшы грант Дзяржд'эпартамента ЗША. Стаў вядучым ток-шоу «Выбар» пасля ад'езду ў Маскву Ягора Хрусталёва. Дарафеева адрозніваe вострy, але паважлівы стыль размовы з гасцямі.

Пасля таго як пайшлі чуткі пра звальненне, прэс-служба АНТ 21 снежня іх абвергла.

**Віталь Несцераў**

# Некаторых вязняў двое сутак трымалі ў аўтазаках

«Нас адмаўляюцца браць на Акрэсціна», — патэлефанаваў у «Нашу Ніву» затрыманы на Плошчы Алесь Мілінец.

«Другія суткі сядзім у аўтазаку. Нас тут 31 чалавек. Кажуць, паперы належным чынам не афармленыя».

Самае прыкрае, што вязні ўжо другія суткі знаходзяцца без усялякай ежы і вады. Пакуль яны дакладна не ведаюць, дзе будуць адбываць пакаранне.

Першы раз Мілінец выйшаў на сувязь з «НН» каля 0.40 панядзелка, апошні раз — у 9.15 аўторка.

20 снежня суд Партызанскага раёна прысудзіў Алесю Мілінцу 12 сутак арышту.

У адным аўтазаку з ім знаходзяцца Леў Міхееў, Сяргей Варфаламееў, Сяргей Шышко, Вячаслаў і Віталь Мурашкевічы, Руслан Ігнатовіч, Сяргей Макашын. Імёны астатніх пакуль невядомыя.

Аляксандр Лукашэнка назваў лічбу 639 затрыманых. Міліцыя статыстыкі не давала. Турма на Акрэсціна не здольная прыняць столькі вязняў. Частку іх размясцілі ў турме Жодзіна, іншых — у цэнтры на вуліцы Скарыны ў Мінску.

**Зміцер Панкавец**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Чарга каля Акрэсціна: людзі шукаюць сваякоў, перадаюць перадачы.**

## У ліку затрыманых — 12-разовая чэмпіёнка Еўропы па каратэ, яе муж і сын



**Святлана і Андрэй Вількіны заўжды разам.**

Падчас акцыі пратэсту 19 снежня ў Мінску былі затрыманыя 12-разовая чэмпіёнка Еўропы па каратэ Святлана Вількіна, яе муж Андрэй, заслужаны трэнер Беларусі, і іх 25-гадовы сын.

«Яна свядома пайшла на гэтую акцыю. Святлана — выкладчык ВНУ, і яна была не задаволеная, як праходзіла датэрміновае галасаванне, што студэнтаў і выкладчыкаў змушалі галасаваць. Так як юрыдычна нічога даказаць немагчыма, яна вырашыла так выказаць свой пратэст», — паведаміла сяброўка Вількінай 20 снежня.

Паводле яе слоў, Вількіна патэлефанавала ёй 19 снежня ў 23.30 і паведаміла, што яны затрыманыя супрацоўнікамі сілавых структур і знаходзяцца ў аўтазаку. «Яна сказала, што ў машыне вельмі шмат людзей і іх некуды вязуць. Затым у 23.50 яна патэлефанавала зноў і паведаміла, што машына спынілася. Відаць, іх прывезлі на Акрэсціна. Пасля гэтага Святлана на сувязь больш не выходзіла, іх мабільныя адключаныя, дома ніхто не адказвае», — сказала сяброўка чэмпіёнкі.

20 снежня суд Першамайскага раёна Вількіну за ўдзел у акцыі аштрафаваў, але выпусціў — нячасты выпадак, большасць затрыманых атрымалі «суткі». Пасля выхаду на свабоду трэнерка распаўсюдзіла наступную заяву: «Я, Вількіна Святлана Барысаўна, прашу не рабіць якіх-небудзь высноў з артыкула, які выйшаў 20.12.2010, бо інфармацыя была паведамлена няправільна словамі маёй знаёмай, якая паддалася паніцы, калі не магла мне датэлефанавацца.

19 снежня мы з мужам прагаласавалі ў раёне 19.30 і вырашылі схадзіць па плошчу паназіраць за абстаноўкай на вуліцы. Было шмат людзей. Мы ўбачылі сына і падышлі да яго. Мы апынуліся сярод вялікай колькасці людзей. Зразумела, трымаліся разам. У выніку апынуліся... не дома, куды збіраліся вярнуцца.

Лічу ўсё, што адбылося, поўным непаразуменнем. Я дапытлівы чалавек, цікаўлюся сітуацыяй, але ў мяне няма падстаў уваходзіць у якія-небудзь рухі.

Лічу неабходным прыносіць карысць сваёй дзяржаве, свайму народу працай, прымаю з падзякай усе магчымасці для развіцця.

Прашу не ствараць вакол мяне шуму ў інтэрнэце ў сувязі з нібыта маімі выказваннямі.

Хачу працаваць і развівацца ў маёй краіне, з маім народам».

Добра ж гулялася ад 19.30 да 23.30 пры мінус 10, але ў добрай кампаніі.

**МБ; БелаПАН**

## Якія ўмовы ў «амерыканцы»?

Расказвае Эніра Браніцкая.

Затрыманыя кандыдаты ў прэзідэнты знаходзяцца ў следчым ізалятары Камітэта дзяржбяспекі. Аб гэтым іх сваякам паведамілі 20 снежня прадстаўнікі КДБ.

У СІЗА КДБ знаходзяцца Уладзімір Някляеў, Андрэй Саннікаў, Віталь Рымашэўскі, Мікалай Статкевіч і Алесь Міхалевіч. Пасля акцыі туды ж былі дастаўленыя Рыгор Кастусёў і Дзмітрый Ус, але іх адпусцілі 20 снежня.

У СІЗА КДБ таксама знаходзяцца жонка Саннікава журналістка Ірына Халіп, давераная асоба Някляева Аляксандр Фядута, кіраўнікі штабоў Рымашэўскага Павел Севярынец і Някляева — Андрэй Дзмітрыеў, рэдактарка сайта «Хартыя-97» Наталля Радзіна і, магчыма, шэраг іншых затрыманых.

Аб утрыманні ў турме КДБ «Нашай Ніве» распавяла Эніра Браніцкая, якая сядзела ў «амерыканцы» ў 2006-м: «Там 19 камер. Ёсць на чатыры месцы, а таксама для дваіх і траіх затрыманых. Некалькі камер не маюць прыбіральні, толькі рукамыйнікі. Там трымаюць толькі мужчын і па патрэбе трэба прасіць ахоўніка, каб вывеў у прыбіральню. Ежа значна лепшая, чым у іншых месцах утрымання. Ёсць свой кухар, які гатуе для невялікай колькасці арыштантаў. Душ два разы на тыдзень.

Лекар — адзін раз, у чацвер. Таму я не ведаю, як там Някляеў і іншыя пабітыя...

Асобна варта сказаць аб супрацоўніках «амерыканкі». Амаль усе маюць вышэйшую адукацыю, і таму стаўленне досыць добрае. У мяне няма нараканняў на іх працу».

Спадарыня Браніцкая таксама распавяла, што нягледзячы на вялікую колькасць затрыманых палітыкаў і актывістаў і тое, што іх хутчэй за ўсё будуць трымаць у розных камерах, месцаў павінна хапіць усім. Камеры ў турме КДБ не бываюць перапоўненымі.

**Алесь Пілецкі**



## Фотафакт: начальнік міліцыі збівае журналіста

Намеснік начальніка ГУУС Мінгарвыканкама Ігар Яўсееў даў выспятка фатографу Уладзю Грыдзіну.

У панядзелак 20 снежня на плошчы Незалежнасці сабраліся 60 юнакоў і пенсіянераў. Яны запомнілі заклік кандыдатаў у прэзідэнты да працягу пратэстаў і падтрымалі яго. На пікетоўцаў адразу накінуліся амонаўцы.

Уладзь акуратна фатаграфаваў збіццё ўдзельнікаў акцыі. Гэта не спадабалася намесніку начальніка ГУУС Мінгарвыканкама Ігару Яўсееву, які браў у збіцці актыўны ўдзел.

Яўсееў дагнаў фатографа і ўдарыў яго нагой, паваліўшы ў снег. Гэты момант зафіксавалі на камеру калегі журналіста.

**Сямён Печанко**

## Бюлетэнь з надпісам «Саня паедзе ў Гаагу» паклалі ў стос за Лукашэнку

Назіральніца Дар'я Каткоўская пайшла на хітрасць, каб выкрыць фальсіфікацыі.

Каткоўская: «Я была назіральніцай на ўчастку № 17 у Фрунзенскім раёне горада Мінска. Гэта Сухарава, гэта той участак, выбарцам якога з'яўляюся я. Каб мяне не арыштавалі і не выдалілі з участка, я паклікала з сабой на падлік галасоў здымачную групу бельгійскага тэлебачання. Я не магу сказаць, што я бачыла, як лічылі галасы. Упершыню (а я назіраю на выбарах з 2001 года) я стаяла ў метры ад стала — мяне трымаў кіраўнік камісіі, мяне трымала міліцыя, — але я стаяла блізка і я бачыла, як НЕ лічаць галасы.

Я бачыла, што галасы адных і тых жа кандыдатаў кладуць у розныя стосы — гэта значыць, што бюлетэні, дзе крыжыкі стаяць у адным месцы, кладуць то ў адзін, то ў другі стос.

Потым. Я галасавала на тым участку і свой бюлетэнь сапсавала. Я не ставіла ніякіх крыжыкаў у квадраціках, замест гэтага напісала на бюлетэні: «Саня паедзе ў Гаагу». У канцы яны сказалі: «Тры сапсаваныя бюлетэні» і паказалі іх. Я кажу: «Прабачце, я выбарніца гэтага ўчастка, тэрмінова шукайце мой бюлетэнь». Праз дзве хвіліны мой бюлетэнь з гэтым надпісам быў знойдзены ў стосе за... А.Лукашэнку.

Такім чынам, папросту ніхто не лічыў гэтыя галасы. Бюлетэні складваліся ў розныя стосікі, гэтыя стосікі неяк фармаваліся, і ў выніку на нашых вачах больш за 80 адсоткаў было аддадзена Аляксандру Лукашэнку. Там запісалі 71 голас за Рыгора Кастусёва, хаця адзіны стос, які я магла бачыць, гэта быў стос якраз за Кастусёва. Я магу сказаць, што там было каля 200 бюлетэняў, калі яны клалі першапачаткова ў гэты стос».

**Мікола Бугай**

## Скандал на выбарчым участку: у скрыні не аказалася 500 бюлетэняў

На выбарчым участку № 104 Маскоўскага раёна Мінска камісія аказалася ў непрыгляднай сітуацыі.

Спачатку было абвешчана, што, згодна са спісамі выбаршчыкаў, было выдадзена 1952 бюлетэні (з іх 213 — датэрміновае, 20 — хатняе, 1719 — агульнае), аднак, калі была адчынена скрыня для галасавання, там аказалася на 500 з нечым бюлетэняў меней. Але назіральнікі былі настырнымі і дабіліся лічэння ўсіх бюлетэняў. Усяго ў скрыні аказалася 1384 бюлетэні.

А каля 500 бюлетэняў зніклі. Магчыма, іх так і не змаглі ўкінуць, дзякуючы пільнасці назіральнікаў, якіх на ўчастку №104 было каля 30 чалавек.

Акрамя таго, сябром выбарчай камісіі тут была прадстаўніца Партыі БНФ Ірына Смяян-Семянюк.

**Наталька Базылевіч**

# Моманты неэлегантнай перамогі

Гэтыя выбары ў Беларусі рэкордныя не толькі па колькасці кандыдатаў. Яны ўвойдуць у сусветную гісторыю, а можа і ў кнігу рэкордаў Гінэса: нідзе ў свеце не бывала, каб у дзень галасавання пасадзілі сем з дзесяці кандыдатаў. Моманты, якімі запомняцца гэтыя выбары.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Збіты, непрытомны Някляеў на снезе / Лукашэнка на прэс-канферэнцыі: «Табе заўтра 70 гадоў, а ты яшчэ не навучыўся мазгамі варушыць».**


СЯРГЕЙ БАЛАЙ

**Рымашэўскаму разбілі галаву дубінкай / Лукашэнка на прэс-канферэнцыі: «А тут і Рымашэўскі, крычыць «далі па галаве». Дык ты ж мужык, ну далі, ну і што?»**



**Саннікаў ляжыць збіты на плошчы Незалежнасці / Лукашэнка на прэс-канферэнцыі: «Але даведалася «мамка» [жонка Саннікава Ірына Халіп] і кажа: «Ты будзеш лідарам!»**


АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

**Удзельнікі маніфестацыі збіраюцца на Кастрычніцкай плошчы / Афіцыйныя СМІ: у акцыі ўдзельнічалі тры тысячы, пераважна падлеткаў.**



АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

**19 снежня на плошчы Незалежнасці сітуацыя змянялася імгненна: Спецназ ужо загарадзіў Дом урада, а лідары яшчэ выступаюць з трыбуны.**


АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

**Гіганцкая дэманстрацыя натхняла мінчукоў.**



**Снайперы на даху Палаца рэспублікі.**

## Студзень

**1** — Новы год.

**1** — 150 гадоў мовазнаўцу Яўхіму Карскаму.

**1** — 75 гадоў пісьменніку Анатолю Кудраўцу.

**6** — Тры каралі ў каталікоў, Вадохрышча ва ўніятаў.

**7** — Раство Хрыстова ў праваслаўных.

**15** — 75 гадоў пісьменніку Янку Сіпакову.

**18** — 75 гадоў перакладчыку Васілю Сёмуху.

**19** — Вадохрышча ў праваслаўных.

**22** — 450 гадоў англійскаму філосафу Фрэнсісу Бэкану.

**26** — 50 гадоў канадскаму хакеісту беларускага паходжання Уэйну Грэцкі.

**27** — 175 гадоў Леапольду Захер–Мазаху, які ўвёў у псіхіятрыю паняцце «мазахізм».

## Люты

**2** — Грамніцы ў каталікоў.

**2** — 475 гадоў заснавальніку Віленскай езуіцкай акадэміі Пятру Скаргу.

**14** — Дзень Святога Валянціна.

**15** — Грамніцы ў праваслаўных.

**21** — Міжнародны дзень роднай мовы.

**28** — Масленіца ў праваслаўных.

## Сакавік

**3** — 50 гадоў амерыканскаму акцёру Эдзі Мэрфі.

**8** — Жаночы дзень.

**9** — Папелец у каталікоў.

**15** — Дзень Канстытуцыі.

**20** — Пурым у юдэяў.

**25** — Дзень Волі.

## Красавік

**1** — Дзень смеху.

**16** — 125 гадоў дзеячу руху працоўных Эрнсту Тэльману.

**23** — 125 гадоў пісьменніку Змітраку Бядулю.

**24** — Вялікдзень у праваслаўных і каталікоў.

**26** — Дзень Чарнобыльскай трагедыі.

## Май

**1** — Дзень працы.

**3** — Радаўніца.

**9** — Дзень Перамогі, Дзень Еўропы.

**11** — Дзень Святога Кірылы Тураўскага.

**16** — 100 гадоў пісьменніку Васілю Вітку.

**24** — Дзень славянскага пісьменства.

**28** — 175 гадоў лінгвісту, фалькларысту, музыказнаўцу Яну Карловічу.

## Чэрвень

**5** — Дзень Святой Еўфрасінні Полацкай.

**9** — Міжнародны дзень сяброў.

**10** — 75 гадоў Вячаславу Кебічу, прэм'ер–міністру Беларусі ў 1990—1994.

**12** — Тройца (Сёмуха) ў праваслаўных, каталікоў.

**23** — Купалле.

**28** — Сабор беларускіх святых.

**29** — Пятра і Паўла ў каталікоў, уніятаў.

## Ліпень

**2** — Дзень Маці Божай Будслаўскай, апякункі Беларусі.

**7** — Іван у праваслаўных.

**12** — Пятра і Паўла ў праваслаўных.

**22** — 75 гадоў балетмайстру, стваральніцы ансамбля «Харошкі» Валянціне Гаявой.

**24** — 250 гадоў аднаму з кіраўнікоў паўстання 1794 года Якубу Ясінскаму.

**25** — 75 гадоў заслужанаму архітэктару Леаніду Левіну.




### Студзень

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| | **7** | 14 | 21 | 28 | |
| **1** | 8 | 15 | 22 | 29 | |
| 2 | 9 | 16 | 23 | 30 | |

### Люты

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 7 | 14 | 21 | 28 |
| 1 | 8 | 15 | 22 | |
| 2 | 9 | 16 | 23 | |
| 3 | 10 | 17 | 24 | |
| 4 | 11 | 18 | 25 | |
| 5 | 12 | 19 | 26 | |
| 6 | 13 | 20 | 27 | |

### Сакавік

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 7 | 14 | 21 | 28 |
| 1 | **8** | 15 | 22 | 29 |
| 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| 4 | 11 | 18 | **25** | |
| 5 | 12 | 19 | 26 | |
| 6 | 13 | 20 | 27 | |

### Красавік

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 4 | 11 | 18 | 25 |
| | 5 | 12 | 19 | 26 |
| | 6 | 13 | 20 | 27 |
| | 7 | 14 | 21 | 28 |
| 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| 3 | 10 | 17 | **24** | |

### Май

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 2 | **9** | 16 | 23 | 30 |
| | **3** | 10 | 17 | 24 | 31 |
| | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| **1** | 8 | 15 | 22 | 29 | |

### Чэрвень

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 6 | 13 | 20 | 27 |
| | 7 | 14 | 21 | 28 |
| 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| 3 | 10 | 17 | 24 | |
| 4 | 11 | 18 | 25 | |
| 5 | 12 | 19 | 26 | |

### Ліпень

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 4 | 11 | 18 | 25 |
| | 5 | 12 | 19 | 26 |
| | 6 | 13 | 20 | **27** |
| | 7 | 14 | 21 | 28 |
| 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |

### Жнівень

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| 4 | 11 | 18 | 25 | |
| 5 | 12 | 19 | 26 | |
| 6 | 13 | 20 | 27 | |
| 7 | 14 | 21 | 28 | |

### Верасень

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 5 | 12 | 19 | 26 |
| | 6 | 13 | 20 | 27 |
| | 7 | 14 | 21 | 28 |
| 1 | **8** | 15 | 22 | 29 |
| 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| 3 | 10 | 17 | 24 | |
| 4 | 11 | 18 | 25 | |

### Кастрычнік

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| 1 | 8 | 15 | 22 | 29 | |
| 2 | 9 | 16 | 23 | 30 | |

### Лістапад

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **7** | 14 | 21 | 28 |
| 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| 3 | 10 | 17 | 24 | |
| 4 | 11 | 18 | 25 | |
| 5 | 12 | 19 | 26 | |
| 6 | 13 | 20 | 27 | |

### Снежань

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 5 | 12 | 19 | 26 |
| | 6 | 13 | 20 | 27 |
| | 7 | 14 | 21 | 28 |
| 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| 4 | 11 | 18 | **25** | |

## Жнівень

**1** — Пачатак месяца Рамадан у мусульманаў.

**5** — 550 гадоў вялікаму князю ВКЛ і каралю Польшчы Аляксандру Ягелончыку.

**6** — Перамяненне Божае ў каталікоў, уніятаў.

**15** — Унебаўзяцце ў каталікоў, уніятаў.

**17** — 100 гадоў савецкаму шахматысту Міхаілу Батвінніку.

**19** — Яблычны Спас у праваслаўных.

**21** — 50 гадоў пісьменніку Вітаўту Чаропку.

**22** — 150 гадоў стваральніку беларускага тэатра Ігнату Буйніцкаму.

**28** — Спленне ў праваслаўных.

**28** — 75 гадоў паэту Генадзю Бураўкіну.

## Верасень

**1** — Сусветны дзень ведаў.

**4** — 75 гадоў пісьменніку Сакрату Яновічу.

**4** — Дзень беларускага пісьменства.

**8** — Дзень беларускай вайсковай славы.

**27** — Узвіжанне Крыжа Гасподняга ў праваслаўных.

**30** — Рош Ашонэ (Новы год) у юдэяў.

## Кастрычнік

**1** — Міжнародны дзень музыкі.

**1** — Пакроў ва ўніятаў, каталікоў.

**2** — Дзень настаўніка.

**10** — 150 гадоў нарвежскаму палярнаму даследчыку Фрыт'ёфу Нансэну.

**14** — Пакроў у праваслаўных.

**25** — 75 гадоў кінарэжысёру Віктару Тураву.

**30** — 75 гадоў мовазнаўцу, славісту Генадзю Цыхуну.

**31** — Ірландска–амерыканскае свята Хэлоўін.

## Лістапад

**1** — Усе святыя ў каталікоў.

**2** — Дзяды.

**6** — Курбан–Байрам у мусульманаў.

**16** — Дзень Маці Божай Вастрабрамскай.

**19** — 300 гадоў расійскаму навукоўцу–энцыклапедысту Міхаілу Ламаносаву.

**25** — 100 гадоў мастаку Яўгену Ціхановічу.

**28** — пачатак Піліпаўкі, посту перад Божым Нараджэннем у праваслаўных.

**28** — 75 гадоў народнай артысткі Беларусі Марыі Захарэвіч.

## Снежань

**3** — Дзень бульбы.

**9** — 120 гадоў паэту Максіму Багдановічу.

**10** — Дзень правоў чалавека.

**17** — Дзень беларускага кіно.

**17** — 125 гадоў кампазітару Міколу Равенскаму.

**25** — Божае Нараджэнне ў каталікоў, уніятаў, пратэстантаў.

## Юбілеі года

850 гадоў з часу стварэння Крыжа Еўфрасінні Полацкай ювелірам Лазарам Богшам.

625 гадоў італьянскаму скульптару Данатэла.

600 гадоў падпісанню Торунскага міру паміж ВКЛ, Польшчай і Тэўтонскім ордэнам, канец Вялікай вайны 1409—1411.

175 гадоў утварэнню Дэмакратычнага таварыства, якое ўзначаліў Франц Савіч.

150 гадоў адмены прыгоннага права ў Расійскай імперыі.

50 гадоў першаму палёту чалавека ў космас.

25 гадоў першаму ноўтбуку, які выпусціла кампанія IBM.

# 2010: Як гэта было, або Хроніка найбольш значных падзей

### Студзень

7 студзеня над галоўнай ёлкай Віцебска на плошчы Перамогі на вышыні 35 метраў залунаў бел-чырвона-белы сцяг. Яго ўзняў віцебскі актывіст Сяргей Каваленка. Навіна пра дзёрзкую акцыю абляцела ўсю краіну. Суд Кастрычніцкага раёна Віцебска ацаніў смелы ўчынак Сяргея ў 3 гады ўмоўна.

9 студзеня на 85-м годзе жыцця памёр пробашч касцёла Святой Ганны ў Мосары Юозас Булька. Па яго ініцыятыве ў Мосары стварылі антыалкагольны музей і Алею цвярознікаў. Айцец Юозас быў вядомы і тым, што яго падазравалі ў дапамозе савецкім уладам у вынішчэнні паваеннага падполля на тэрыторыі Літвы.

12 студзеня востраў Гаіці скалануў магутны землятрус. Загінула каля 223 тысяч чалавек, былі параненыя 311 тысяч. Апошні раз Гаіці перажывала падобную катастрофу каля 250 гадоў таму. Краіна дагэтуль не пераадолела наступствы трагедыі.

### Люты

1 лютага Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ №60 «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента сеткі інтэрнэт». Кантроль за рэгуляваннем нацыянальнага сегмента сусветнага сеціва перайшоў да Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі прэзідэнта.

Стартавала грамадзянская кампанія «Гавары праўду», яе лідарам стаў паэт Уладзімір Някляеў.

Беларусь наведаў легендарны канадскі хакеіст Уэйн Грэцкі. Ён мае беларускія карані.

Старшыня Грамадскай рады па маральнасці Мікалай Чаргінец па свойму адрэагаваў на планы сусветнавядомага нямецкага гурта Rammstein. Ён запатрабаваў зладзіць папярэдні прагляд праграмы. Ініцыятыва выклікала скандал, пра які актыўна пісала нямецкая прэса.

Ва Украіне ў другім туры прэзідэнцкіх выбараў перамог лідар Партыі рэгіёнаў Віктар Януковіч.

### Сакавік

У Беларусь прыйшла вялікая вада. Каля Стоўбцаў утварылася невялікае мора.

Пачаўся працэс па справе Міколы Аўтуховіча. Упершыню ў гісторыі незалежнай Беларусі да суда дайшла справа па артыкуле «Тэрарызм». Аўтуховіча і яго паплечнікаў абвінавацілі ў арганізацыі замаху на высокіх дзяржчыноўнікаў.

22 сакавіка памёр гісторык Кастусь Тарасаў.

Пры канцы сакавіка невядомы забойца трымаў у страху ўвесь Магілёў. На вуліцы Фаціна 23 сакавіка былі знойдзены раздзеленыя труп 35-гадовай магіляўчанкі, а 31 сакавіка знайшлі цела 40-гадовай жанчыны. Забойцам апынуўся 39-гадовы беспрацоўны Мікалай Цімашэнка. Ён патлумачыў, што забіў жанчын за абразы з іхняга боку. Яго прысудзілі да пажыццёвага зняволення.

29 сакавіка ў маскоўскім метро прагучалі выбухі. Загінулі чатыры дзясяткі чалавек, у тым ліку тэрарысткі-смяротніцы.

### Красавік

7 красавіка ў Кіргізіі апазіцыя зрынула рэжым Курмамбека Бакіева. У сталіцы краіны пралілася кроў — ахвяры былі з абодвух бакоў. Бакіеў пакінуў краіну, каб потым з'явіцца ў Беларусі.

10 красавіка пад Смаленскам разбіўся самалёт прэзідэнта Польшчы, які накіроўваўся ў Катынь для ўшанавання памяці расстраляных афіцэраў Войска польскага. У авіякатастрофе загінулі ўсе 96 чалавек, якія знаходзіліся на борце Ту-154 (М), у тым ліку прэзідэнт Лех Качыньскі і яго жонка Марыя.

У той самы дзень у Мінску каля пасольства Польшчы прайшла арганізаваная праз інтэрнэт грамадзянская акцыя памяці ахвяраў катастрофы.

25 красавіка ў Беларусі прайшлі выбары ў мясцовыя саветы. Яны пабілі рэкорд па колькасці выбаршчыкаў, што прагаласавалі датэрмінова.

Вывяржэнне вулкана Эяф'ятлаякудль у Ісландыі спаралізавала авіязносіны па ўсёй Еўропе.

### Май

5 мая прадпрымальнік Мікола Аўтуховіч атрымаў 5 гадоў турмы за захоўванне 5 патронаў. Уладзімір Асіпенка быў асуджаны на 3 гады калоніі за захоўванне і перавозку зброі. Абвінавачванні ў падрыхтоўцы да забойства чыноўнікаў былі зняты.

9 мая ў Мінску ў часе святочных мерапрыемстваў ледзь не сутыкнуліся вайсковыя самалёты. Пралёт групы бамбавікоў Су-24 адбываўся над густанаселенымі кварталамі. За парадам назіралі тысячы гледачоў.

18 мая ў офісах грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду» па ўсёй краіне прайшліператрусы і затрыманні. Былі арыштаваныя Уладзімір Някляеў і шэраг яго паплечнікаў.

### Чэрвень

4-6 чэрвеня ў Гродне прайшоў чарговы Фестываль нацыянальных культур. У часе фэсту адбыўся дэбют новага кіраўніка вобласці Сямёна Шапіры, які змяніў на гэтай пасадзе адыёзнага Уладзіміра Саўчанку.

Стартаваў Чэмпіянат свету па футболе, які гэтым разам прайшоў у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы.

У расійскім Прымор'і сілавікі разграмілі ўзброеную групу, якая абвясціла вайну міліцыі. Канфлікт прыцягнуў увагу сусветных СМІ.

### Ліпень

Беларусь, Польшча і Літва адзначыла 600-годдзе Грунвальдскай бітвы. У Навагрудку свята адкрывалі міністр культуры Павел Латушка і старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён Шапіра.

На 94-м годзе жыцця памёр былы генеральны сакратар кампартыі Чылі Луіс Карвалан.

На расійскім канале НТВ паказалі дакументальны фільм «Хросны бацька», поўны зніштальнай крытыкі прэзідэнта Лукашэнкі. Гэтак у расійскіх СМІ стартавала кампанія па дыскрэдытацыі Лукашэнкі і яго атачэння. Фільм меў працяг. Спецнумар «НН», прысвечаны фільму, не трапіў у продаж «Белсаюздруку».

### Жнівень

У Беларусі адзначаўся 100-гадовы юбілей паэткі Ларысы Геніюш.

На Еўропу абрушылася фенаменальная спёка. У Беларусі трывала трапічная спёка, Расія задыхалася ад смуроду пажараў.

30 жніўня невядомыя атакавалі кактэйлямі Молатава пасольства Расіі ў Мінску. Па ўсёй краіне пракацілася хваля затрыманняў сярод анархістаў.

Аляксандр Лукашэнка змяніў дату свайго дня нараджэння — замест звыклага 30 жніўня ў яго найафіцыйнай біяграфіі з'явілася 31 жніўня.

У Чылі пад заваламі апынуліся 33 гарняка. Сучасныя сродкі камунікацыі ператварылі выратавальную аперацыю ў сусветнае рэаліці-шоу.

### Верасень

3 верасня на ўласным лецішчы быў знойдзены павешаным стваральнік апазіцыйнага сайта Charter'97 Алег Бябенін. Следства заявіла пра самагубства. Сябры і знаёмыя выказалі версію пра забойства.

У Польшчы ў жудаснай аварыі загінулі 5 беларусаў. Прыватныя прадпрымальнікі ехалі на двух мікрааўтобусах, адзін з іх сутыкнуўся з фурай і сачыніў другі аўтобус.

Беларуская зборная па футболе сенсацыйна перамагла французаў у адборачным матчы да чэмпіянату Еўропы па футболе — 2012 на славутым «Стад дэ Франс». А жаночая зборная па баскетболе заняла 4-е месца на Чэмпіянаце свету ў Чэхіі, дзе разграміла зборную Расіі.

### Кастрычнік

Касцёл Сымона і Алены ў Мінску адзначыў 100-гадовы юбілей.

Пачаўся збор подпісаў за кандыдатаў у прэзідэнты. Гэтая кампанія падарыла нечаканае свята дэмакратыі: пікеты пад нацыянальнымі і партыйнымі сцягамі з музыкай і песнямі на цэнтральных вуліцах беларускіх гарадоў.

У Беларусь прыязджала з візітам прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайце.

Памёр гісторык Павел Лойка, аўтар першых падручнікаў па гісторыі да моманту атрымання краінай незалежнасці.

25 кастрычніка бяда прыйшла ў Пінск. У адным з цэхаў мэблевай фабрыкі «Пінскдрэў» прагрымеў выбух, загінулі 14 чалавек. Жалоба была абвешчаная толькі на тэрыторыі Брэсцкай вобласці.

### Лістапад

На кінафестывалі «Лістапад» прэзентавалі «Масакру» Андрэя Кудзіненкі, першы бульба-хорар, як акрэсліў сваю працу сам рэжысёр.

Пайшоў з жыцця Міхась Савіцкі. Разам з ім адыйшла эпоха суровага сімвалізму.

У аўтакатастрофе загінуў акадэмік Іван Нікітчанка. Яго легкавік сутыкнуўся з ЗІЛам.

У Навагрудку на царкве Барыса і Глеба ўсталявалі купалы-цыбуліны. Разгарэўся скандал.

Цэнтрвыбаркам зарэгістраваў кандыдатамі ў прэзідэнты 10 чалавек, усяго на высокую пасаду сёлета прэтэндавала 19 асобаў.

Сайт Wikileaks справакаваў скандал сусветнага маштабу, пачаўшы выкладаць у вольны доступ чвэрць мільёна сакрэтных дэпеш з пасольстваў ЗША за мяжой. Беларусі прысвечана не менш за тысячу дакументаў.

### Снежань

У Мінску прайшоў 4-ы Усебеларускі сход, арганізаваны ўладамі. Праваабаронцы назвалі яго «рэкламай Лукашэнкі за дзяржаўны кошт». Дэлегаты сходу адных толькі падарункаў атрымалі больш чым на 500 мільёнаў далярaў.

На саміце ў Маскве Лукашэнка падпісаў дамову аб стварэнні Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП) на ўмовах Расіі. Ён паабяцаў ратыфікаваць дамову да 1 студзеня 2011 г.

Масавыя сутыкненні футбольных фанатаў з АМАПам у Расіі з нагоды забойства заўзятара маскоўскага «Спартака».

У Лондане акцыя пратэсту студэнтаў супраць павышэння аплаты за вучобу ў 3 разы скончылася пагромамі. Напалі нават на аўто прынца.

19 снежня — у Беларусі адбыліся выбары прэзідэнта.

**Падрыхтаваў Сямён Печанко**

### ЗДЫМКІ ГОДА



Спецслужбіст выносіць камп'ютары, сканфіскаваныя ў «Хартыі-97».



На фільм «Хросны Бацька» лукашэнкаўцы адказалі маштабнай антырасійскай кампаніяй.

### ЗДЫМКІ ГОДА



Асабісты канфлікт разгарэўся ў Лукашэнкі з Мядзведзевым. На саміце ў Ерэване кіраўніка Беларусі ігнаравалі.

### Яны адышлі ад нас за 2010 год

**Юозас Булька** — пробашч касцёла святой Ганны ў Мосары Глыбоцкага раёна
**Ванда Скуратовіч** — праведніца народаў свету, беларуска, якая ратавала яўрэяў у вайну
**Антон Маркевіч** — беларускі дзеяч у Канадзе
**Эрык Сігал** — амерыканскі пісьменнік, аўтар рамана «Гісторыі кахання»
**Леанід Нячаеў** — кінарэжысёр, зняў славутыя «Прыгоды Бураціна»
**Джэром Сэлінджэр** — амерыканскі пісьменнік, аўтар рамана «Лавец у жыце»
**Анатоль Сазонаў** — лекар, удзельнік нацыянальнага руху, Слуцк
**Юліюш Бардах** — польскі гісторык, што даследаваў Вялікае Княства Літоўскае
**Ірына Архіпава** — оперная спявачка
**Вадзім Аршынскі** — магілёўскі аператар «Белсата»
**Лазар Лазараў** — расійскі літаратуразнаўца, сябар Быкава
**Аляксандр Кулакоўскі** — беларускі святар у Аўстраліі
**Вітаўт і Вера Рамукі** — беларусы з Чыкага
**Валянціна Талкунова** — расійская спявачка
**Кастусь Тарасаў** — пісьменнік, аўтар гістарычных твораў
**Кастусь Маскалік** — беларускі святар у Вялікабрытаніі
**Лех і Марыя Качынскія** — прэзідэнт Польшчы і ягоная жонка
**Алег Елізараў** — мастак
**Дыа** — славуты рок-спявак
**Іна Калпашнікава** — мадэльерка
**Кастусь Жылінскі** — беларускі студэнт у Гданьску
**Сяргей Буткевіч** — журналіст, Віцебск
**Міхась Барысевіч** — настаўнік фізкультуры ў Коласаўскім ліцэі
**Андрэй Вазнясенскі** — расійскі паэт
**Пётра Маланачкін** — грамадскі актывіст, Горкі
**Людміла Русава** — мастачка-перформерка
**Міхаіл Паўлаў** — былы старшыня Мінгарвыканкама
**Жазэ Сарамага** — партугальскі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі
**Сяргей Язерскі** — доктар-псіхатэрапеўт, выкладчык Коласаўскага ліцэя
**Альгірдас Бразаўскас** — былы прэзідэнт Літвы
**Уладзімір Ісаенка** — археолаг
**Анатоль Бразоўскі** — беларускі дзеяч з Аўстраліі, падпісчык «Нашай Нівы»
**Дзям'ян Франкоўскі** — сацыял-дэмакрат, інтэрнэтчык, Горкі
**Іван Апет** — вязень сталінскага ГУЛАГа, Барысаў
**Ігар Дабралюбаў** — кінарэжысёр, аўтар «Белых росаў»
**Луіс Карвалан** — лідар кампартыі Чылі
**Алена Залеская** — актывістка апазіцыі, АГП, Віцебск
**Яўген Ігнацьеў** — кінарэжысёр, экранізаваў «Людзей на балоце»
**Вячаслаў Дубінка** — фатограф і пісьменнік, адраджэнец беларускай выцінанкі
**Клод Шаброль** — французскі кінарэжысёр
**Сяргей Гоманаў** — вядомы ў мінулым футбаліст
**Генадзь Янаеў** — адзін з кіраўнікоў путчу 1991
**Алег Бябенін** — журналіст, рэдактар «Хартыі-97»
**Тоні Кёрціс** — амерыканскі акцёр
**Норман Уіздам** — англійскі комік
**Ігар Маскаленка** — бубнач, быў ударнікам гуртоў «Крама» і «Песняры»
**Джоан Сазэрлэнд** — оперная спявачка
**Павел Лойка** — гісторык
**Віктар Чарнамырдзін** — былы прэм'ер-міністр Расіі
**Міхаіл Савіцкі** — народны мастак
**Янка Жучка** — беларускі дзеяч у Бельгіі
**Іван Нікітчанка** — прафесар, арганізатар «Чарнобыльскіх шляхоў»
**Уладзімір Маслачэнка** — футбольны каментатар
**Леслі Нільсэн** — амерыканскі комік
**Бэла Ахмадуліна** — расійская паэтка
**Міхаіл Мязяк** — дзеяч нацыянальнага руху, Бабруйск
**Вольга Самусік** — спявачка
**Аляксандр Гарбылёў** — футбольны спецыяліст
**Аляксей Міклашэвіч** — брат Ларысы Геніюш

**Падрыхтаваў Зміцер Панкавец**

# Чалавек года — Мікалай Казлоў

**По традыцыі ў апошнім нумары «Наша Ніва» вызначае людзей года. Тых, чые ўчынкі запомніліся, паўплывалі на гісторыю. Самыя яркія асобы года ў рэйтынгу «НН».**


АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

Сёлета наш выбар паў на Мікалая Казлова.

Падпалкоўнік міліцыі Мікалай Казлоў прадэманстраваў асабістую мужнасць і прыстойнасць. Яшчэ ў 2008 годзе ён афіцыйна зафіксаваў укіды бюлетэняў на адным з выбарчых участкаў у Мінску. Казлова прасілі адклікаць гэты рапарт, замяць справу. Міліцыянт праявіў прынцыповасць.

Сітуацыя разгортвалася так, што ў апошні дзень датэрміновага галасавання старшыня камісіі папрасіла ў Казлова ключы ад памяшкання, дзе знаходзілася скрынка. Казлоў адмовіўся, але потым яму паступіў званок ад уласнага начальніка. Тым не менш, міліцыянт напісаў рапарт.

Яму паабяцалі, што справу раскрыюць. Сёлета ён пераканаўся, што ніхто раскрываць гэтае злачынства не збіраецца. Казлоў звярнуўся да журналістаў.

Ярмошына назвала ягоныя паказанні «старой правакацыяй».

Калі Казлоў агучваў гэтыя звесткі, то ён не шукаў уласнай выгады. Ён па-ранейшаму працягвае жыць у Беларусі і нікуды з'язджаць не збіраецца. У выпадку суда ён гатовы даць паказанні. Чалавекам проста рухала ўзмоцненае пачуццё справядлівасці.

Учынак Казлова стаў прыкладам для іншых людзей, што таксама былі сведкамі парушэнняў закона, але не адважваліся пра іх заявіць. Гэтак, былы старшы следчы жодзінскай міліцыі Андрэй Пыжык расказаў, як яго прымушалі сфальшаваць крымінальную справу супраць ветэрана-афганца, які стаў лідарам апазіцыі ў Жодзіне.

## Палітык года — Мікалай Аўтуховіч

Ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч з гонарам вынес судовы працэс. Яго абвінавачвалі ў падрыхтоўцы тэракта супраць старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі і намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Камянко. Аўтуховіча можна лічыць пераможцам, бо абвінавачванні былі знятыя. Аднак былога афганца ўсё адно «закрылі» за пяць патронаў на пяць гадоў. Цяпер ён працягвае адбываць пакаранне ў Івацэвіцкай калоніі.

## Гаспадар года — Уладзімір Матусевіч

Свой маёнтак Мацкі фермер Уладзімір Матусевіч пачаў ствараць яшчэ пры канцы 1980-х. Ён кажа, што хацеў адысці ад звыклай у нашым разуменні вёскі. Ён браў прыклад з гаспадарак Францыі, Вялікабрытаніі.

Прычым, форма ўласнасці ў яго якраз і называецца маёнтак, хоць і даводзілася шмат пavaяваць праз гэта з бюракратамі. Усе паперы Матусевіч запаўняў толькі пабеларуску.

Сёння ягоная гаспадарка спецыялізуецца на гародніне. Ён вырошчвае практычна ўсе віды капусты, якія ёсць у свеце, а таксама цыбулю, сельдэрэй, пятрушку. А яшчэ цэлыя плантацыі кветак. Гэта тытанічная праца, але радасная. Матусевіч будуе свае Мацкі так, якой хоча бачыць усю Беларусь.

У асобе спадара Уладзіміра Матусевіча мы ўшаноўваем усіх новых беларускіх гаспадароў.

## Герой года — Сяргей Каваленка

На праваслаўнае Раство будаўнік Сяргей Каваленка вывесіў вялізны бел-чырвона-белы сцяг на галоўнай ялінцы Віцебска. Прыгожы ўчынак мужнага чалавека. Каваленка не адмаўляўся, сказаўшы, што для яго гэта справа гонару. Пад ціскам грамадскасці мужчыну вызвалілі з турмы, пакаралі ўмоўным тэрмінам. Думалі, што супакояць, але нічога падобнага.

## Вернасць года — Тарэса Собаль

Сёлета атрымаў працяг ціск на сяброў неафіцыйнага саюза палякаў. Полем бітвы стала мястэчка Івянец. Мясцовая старшынька СПБ Тарэса Собаль засталася вернай саюзу Анжалікі Борыс. На немаладую жанчыну заводзілі крымінальныя справы, цкавалі ў дзяржаўных СМІ. Собаль засталася пры сваіх перакананнях. І пазіцыю сваёй старшынькі падтрымалі многія мясцовыя палякі, якія прадэманстравалі прыклад салідарнасці.

## Аванс года — Сямён Шапіра

Месца скампраметаванага Уладзіміра Саўчанкі на пасадзе старшыні Гродзенскага аблвыканкама заняў былы міністр сельскай гаспадаркі Сямён Шапіра. Ён з энтузіязмам узяўся за справу і дэманструе яксна іншы стыль кіравання. Тыя, хто сутыкаўся з Шапірам, адзначаюць ягоную дэмакратычнасць і выхаванасць. А яшчэ гродзенскі начальнік узяўся за беларусізацыю, чым заслужыў павагу.

## Страты года — Алег Бябенін, Лех Качынскі

У пачатку верасня трагічна скончылася жыццё журналіста, рэдактара сайта «Хартыі-97» Алега Бябеніна. Яго знайшлі ў пятлі на ўласным лецішчы пад Мінскам. Праваахоўнікі сцвярджаюць, што гэта самагубства. З імі пагадзіліся эксперты АБСЕ. Сябры і калегі кажуць, што не ўсё ў гэтай справе так празрыста. Смерць Бябеніна працягвае ахутваць таямніца.

У красавіку ў авіякатастрофе загінуў прэзідэнт Польшчы Лех Качынскі, ягоная жонка Марыя, а таксама шматлікія прадстаўнікі польскай эліты. Катастрофа выклікала спачуванні ва ўсім свеце. Ля пасольства Польшчы ў Мінску імгненна з'явіліся кветкі і свечкі. Прычым гэтая салідарнасць была абсалютна не цэнтралізаванай, была памкненнем сэрцаў звычайных людзей. Тым не менш, Беларусь засталася адзінай суседкай Польшчы, што не абвясціла жалобы па памерлых.

## Ахвяры года — пінчукі

У кастрычніку на заводзе «Пінскдрэў» адбыўся выбух, у выніку якога пачаўся пажар. Гэта было ў працоўны час, калі людзі знаходзіліся на месцах. У выніку здарэння загінула чатырнаццаць чалавек. Вось іх прозвішчы: Ігар Муга, Яўген Рапута, Міхаіл Сарадуб, Аляксандр Міхаевіч, Кацярына Саковіч, Віктар Жукоўскі, Генадзь Казюр, Аляксандр Калодзіч, Сяргей Тарэлка, Алег Квашалі, Аляксандр Мароз, Аляксандр Хамлюк, Мікалай Шаўчук, Аляксандр Шынкарук.

Толькі пасля трагедыі загаварылі пра зношанасць абсталявання, пра іншыя праблемы. Жалоба па ахвярах Пінска так і не была абвешчаная.

## Уцякач года — Курманбек Бакіеў

У красавіку прэзідэнта Кыргызстана Курманбека Бакіева скінулі з пасады. Спачатку ён хаваўся на поўдні краіны, а потым вылецеў у Беларусь. Бакіева абвінавачвалі ў карупцыі і клянавасці. Акцыі пратэсту падтрымліваліся з Масквы. Лукашэнка сказаў, што паступіць паіншаму не мог. Хоць гэта і выклікала раздражненне Крамля. Бакіеву былі выдзелены асобны катэдж і ахова. З Мінска ён некалькі разоў спрабаваў паўплываць на падзеі на радзіме.

## Журналіст года — Джуліян Асанж

39-гадовы інтэрнэт-журналіст Джуліян Асанж прадэманстраваў, што закрытай інфармацыі не існуе. Яшчэ ў 2006 годзе ён стварыў сайт Wikileaks, дзе пачаў друкаваць сакрэтныя матэрыялы. Натуральна, што імёны сваіх інфарматараў ён не называў. Асанж друкаваў матэрыялы, датычныя вайны ў Афганістане. А пры канцы года ў інтэрнэце сталі з'яўляцца дэпешы пасольстваў ЗША з розных краінаў свету. З іх мы даведаліся мноства пра моцных гэтага свету. Гэта выклікала буйныя скандалы. Адны лічаць Асанжа героем, іншыя — злодзеем. Тым не менш, ён выканаў правіла журналіста — даць доступ чытачу да інфармацыі.

## Візіцёрка года — Даля Грыбаўскайце

Прэзідэнт Літвы была адзінай кіраўніцай краінаў Еўрасаюза, што сёлета прыехала ў Мінск. Грыбаўскайце адлюстроўвае пазіцыю пэўнай часткі людзей на Захадзе, што Лукашэнку трэба прыняць такім, які ён ёсць, бо гэта аддаліць Беларусь ад Расіі. На адной з закрытых нарадаў Грыбаўскайце сказала, што хоча, каб у Беларусі перамог Лукашэнка.

## Дабрачынца года — Таццяна Салдаценка

Дзяўчына чатыры гады апякуецца пацыентамі дзіцячага анкагематалагічнага цэнтра. Сама Салдаценка нарадзілася праз два дні пасля Чарнобыльскай трагедыі. Дабрачыннасць у такім месцы — псіхалагічна цяжкая праца. Шмат хто з пацыентаў так і не перамадольвае хваробу. Тым не менш, Салдаценка спраўляецца з такой нялёгкай задачай.

## Спартовец года — Аляксей Грышын

Фрыстайліст здабыў першы залаты медаль для Беларусі на Зімовых алімпійскіх гульнях. На яго асаблівa ніхто і не спадзяваўся. Уся ўвага перад стартам аддавалася Антону Кушніру і Дзмітрыю Дашчынскаму. Першы не аваладаў хваляваннем яшчэ ў кваліфікацыі, другі — падчас першага фінальнага скачка. Роля лідара нечакана выпала на плечы Грышына, і ён даў сабе рады бліскуча.

Беларусь мае ўнікальную школу фрыстайла. Ад 1998 года нашы спартоўцы заўсёды бяруць медалі на Алімпіядах. І гэта пры тым, што колькасць дзяцей, што ідзе ў гэты захаплялны від спорту, не такая вялікая. Не раўня футболу і хакею. Прафесійная хвароба фрыстайлістаў — спінная грыжа. Грышын таксама пакутуе на яе.

Працяг на старонцы 12.

## ЗДЫМКІ ГОДА


**Лукашэнка і Грыбаўскайце ў Мінску.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Памяці Леха Качынскага — палітыка рэдкай мужнасці.**

# Чалавек года — Мікалай Казлоў

Працяг са старонкі 11.

Таксама спартоўкай года магла быць біятланістка Дар'я Домрачава. Яе сонечная ўсмешка неаднаразова ззяла на п'едэстале гонару.

## Каманда года — баскетбалісткі

У гульнявых відах спорту мы не маем вялікіх дасягненняў. Чакалі поспехаў ад хакея, а ён прыйшоў ад баскетбалістак. Беларускія дзяўчаты занялі чацвёртае месца на чэмпіянаце свету, разграміўшы ў чвэрцьфінале расіянак. У дзяўчат з каманды закахаліся ўсе заўзятары.

## Рэжысёр года — Андрэй Кудзіненка

Аўтар славутай «Акупацыі. Містэрыі» Андрэй Кудзіненка стварыў на «Беларусьфільме» стужку «Масакра». У ёй шляхта размаўляе па-беларуску і ператвараецца ў мядзведзяў. А ўніяцкі бацюшка рыхтуе зброю для паўстання. Адны хваляць фільм, іншыя — ганяць. У Расіі наўрад ён будзе папулярным, бо незразумелыя рэаліі. Кудзіненка стварыў першы сапраўды беларускі фільм XXI ст.

## Прыкаліст года — Яўген Ліпковіч

Ягоная кампанія на мясцовых выбарах выйшла самай яркай. Скандальны блогер не даваў спакою чыноўнікам і вахцёркам, маляваў калажы ў інтэрнэце. Але ўрэшце зняўся, прызнаўшы, што гэта быў толькі прыкол. На прэзідэнцкіх выбарах ён таксама не застаўся без справаў. Менавіта Ліпковіч прыдумаў лозунг «Кастусёў или смерть».

## Грудзі года — Кацярына Нікандрава

Дзяўчына сёлета не толькі выйграла конкурс «Міс грудзі Беларусі», але і праявіла грамадзянскую пазіцыю, уступіўшы ў ініцыятыўныя групы Уладзіміра Някляева і Яраслава Раманчука.

## Беларус года — Хрыстафор Калумб

Пад канец года аматары гісторыі насмяяліся — адзін партугальскі гісторык вывеў род вялікага падарожніка Хрыстафора Калумба з Вялікага Княства Літоўскага. За гэтую вестку схапіліся літоўцы і палякі, назваўшы яго сваім. Беларусы на гэты раз таксама вырашылі не аддаваць славутасцяў суседзям. Калумб быў беларусам таксама!

**Зміцер Панкавец**

**Людзі мінулых гадоў па версіі «НН»**

2003 — музычны прадзюсар Віталь Супрановіч
2004 — старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанна Літвіна
2005 — кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Мілінкевіч
2006 — чалавек Плошчы
2007 — «Маладафронтавец»
2008 — трэнер БАТЭ Віктар Ганчарэнка
2009 — Наталка Васілевіч і іншыя дабрачынцы

## ЗДЫМКІ ГОДА



**Тарэса Собаль засталася вернай Саюзу палякаў.**



**Грышын — беларускі медаліст.**


**Сяргей Каваленка залез у Віцебску на 35-метровую яліну і вывесіў бел-чырвона-белы сцяг.**



**Блогер Ліпковіч прыкалоўся па поўнай.**



**Міс Грудзі Беларусі Каця Нікандрава.**



**Учора ты прэзідэнт, а сёння пенсіянер. Бакіеў у Мінску.**



**Месца скампраметаванага Уладзіміра Саўчанкі на пасадзе старшыні Гродзенскага аблвыканкама заняў былы міністр сельскай гаспадаркі Сямён Шапіра. Ён узяўся за беларусізацыю, чым заслужыў павагу.**

# Затрыманыя 19 снежня

Пазначанае знаходжанне і прысуд, калі яны былі вядомыя на момант падрыхтоўкі матэрыялу.

Абрамчык Мая
Агеева Ірына — 10 сутак арышту, у ізалятары на вул. Скарыны,20
Агрыйцовіч Аляксей (або Аляксандр) — 10 сутак арышту
Акуліч Аляксей
Александровіч Вадзім, карэспандэнт газеты «Белорусы і рынок» — знаходзіўся ў Ленінскім РУУС Мінска
Алібовіч Александрына — 10 сутак арышту
Альшэўскі Зміцер
Альшэўскі М.І. — суд Заводскага раёна Мінска
Аляшчук Раман
Анішчанка Сяргей — 15 сутак арышту
Аняньхоў Сяргей (БХД) — 10 сутак арышту
Антонава Марыя (грамадзянка Расіі) — карэспандэнтка France Presse
Анушкевіч Віктар — 12 сутак арышту
Апраніч Аляксандр — 15 сутак арышту
Арлоў (не пісьменнік) — суд Маскоўскага раёна Мінска
Аркушэвіч Віктар
Арцыбашаў Аляксандр (моцна збіты, у шпіталі)
Асанаў Андрэй (Шчучын) — суд Ленінскага раёна Мінска
Астапенка А.С. — суд Кастрычніцкага раёна Мінска
Астаф'еў Аляксандр (Санкт-Пецярбург, газета «Мой район») — у судзе Партызанскага раёна Мінска
Асюк А.К. — штраф 50 базавых велічынь (1750000 руб.)
Атакулава Людвіся — адпусцілі
Атамановіч Міхаіл — 10 сутак арышту
Атрошчанкаў Аляксандр — прэс-сакратар Андрэя Саннікава, затрыманы ноччу з 19 на 20 снежня ў сваёй кватэры
Ахрэменка — суд Першамайскага раёна Мінска
Ашурок Вітольд — 12 сутак арышту
Багінская Ніна, пенсіянерка
Бадзейка Святлана
Базінская Яўгенія — суд Кастрычніцкага раёна Мінска
Байкова Марыя
Балук Е.М. — суд Кастрычніцкага раёна Мінска
Бандарчук Дзмітрый — суд Маскоўскага раёна Мінска
Бандарэнка Зміцер — давераная асоба Андрэя Саннікава, затрыманы ноччу з 19 на 20 снежня ў сваёй кватэры
Банікевіч (Банюкевіч) Арсень — 10 сутак арышту
Баравіцкі С.А. — суд Заводскага раёна Мінска
Баркоўскі Павел (Мінск)
Бараноўская Н.А. — суд Заводскага раёна Мінска
Барсукоў Міхаіл
Барсукоў Сяргей
Барсукоў (імя невядома) — суд Маскоўскага раёна Мінска
Барткевіч Алена — штраф у 30 базавых велічынь (1050000 руб.)
Барэйчук Святлана
Батура — суд Першамайскага раёна Мінска
Батусевіч Андрэй
Бачыла Улад — штраф 30 базавых велічынь (1050000 руб.)
Башкевіч Аляксандр Мікалаевіч — на сутках у ізалятары на Акрэсціна
